ЛіМ

Літаратура і мастацтва

Газета творчай інтэлігенцыі Беларусі

№ 47 (5152) 26 лістапада 2021 г. ISSN 0024-4686

16+

Курс на збліжэнне культур стар. 4

Пра што нам шэпча неба? стар. 6

Песняй «Свята» багата стар. 14

Пракладваць сумесную дарогу

Фота БелТА.

Зноў Мінскі міжнародны кінафестываль «Лістапад» сабраў аматараў кіно і яго стваральнікаў. Падчас сёлетняга кінафоруму прайшлі паказы амаль сотні карцін, і паглядзець іх у Мінску можна было ў пяці кінатэатрах. Галоўнай конкурснай пляцоўкай для дэманстрацыі стужак асноўнага конкурсу стаў кінатэатр «Цэнтральны». Цырымонія закрыцця пройдзе сёння ў «Маскве».

Дэвіз 27-га «Лістапада»: «Кіно — сімфонія адзінства». Гэтая сімвалічная назва — ідэя новага арганізатара. Нацыянальная кінастудыя «Беларусьфільм» прадставіла фестываль у абноўленым фармаце: з адметнай геаграфіяй, лагатыпам, прызам і чатырма конкурснымі праграмамі: ігравое кіно, дакументальнае, кіно маладых творцаў, кіно для дзяцей «Лістападзік». Нават пазаконкурсная праграма стала насычанай.

Усяго дырэкцыя фестывалю атрымала 273 заяўкі з 54 краін, сярод якіх як даўнія кінапартнёры, так і новыя — з Лацінскай Амерыкі, Паўднёва-Усходняй Азіі, Заходняй і Цэнтральнай Еўропы. Арганізатары спадзяюцца, што кіно стане адным з масткоў паміж людзьмі розных краін. І такая мэта вартая ўхвалення.

Працяг на стар. 5 ►

«ЛіМ»-акцэнты

Дата. Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка павіншаваў калектыў Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Якуба Коласа з 95-годдзем з дня заснавання ўстановы. Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што за гады актыўнай і плённай працы тэатр прайшоў вялікі шлях і заняў ганаровае месца ў культурнай прасторы Беларусі. «Дзякуючы таленавітым, адданым свайму прызванню і захопленым любімай справай супрацоўнікам тэатр заваяваў вялікую і ўдзячную аўдыторыю прыхільнікаў, набыў прызнанне прафесіяналаў», — гаворыцца ў віншаванні. Кіраўнік дзяржавы выказаў упэўненасць, што тэатр і ў далейшым будзе прадаўжаць найлепшыя культурныя традыцыі, садзейнічаць выхаванню ў гледачоў высокіх духоўных якасцей і патрыятызму.

Падзея. Аляксандр Лукашэнка накіраваў віншаванне з адкрыццём форуму ўдзельнікам XXVII Мінскага міжнароднага кінафестывалю «Лістапад» . «Гэта сапраўдная свята таленту і духоўнасці. Пад яго эгідай аб'ядноўваюцца прызнаныя майстры і адораная моладзь, дэманструюцца найлепшыя дасягненні нацыянальных кінашкол», — гаворыцца ў віншаванні. Прэзідэнт адзначыў, што дзвіз сёлетняга фестывалю «Кіно — сімфонія адзінства» адлюстроўвае імкненне да гармоніі, стваральнай дзейнасці і захавання традыцый фестывальных сустрэч, якія славяцца дружалюбнай атмасферай. «Упэўнены, што мерапрыемства стане значнай падзеяй года і падорыць гледачам шмат яркіх уражанняў і пазітыўных адкрыццяў», — падкрэслена ў віншаванні.

Юбілей. Прэзідэнт Беларусі таксама павіншаваў заслужанага дзеяча мастацтваў Расіі Аляксандра Маслякова, якому споўнілася 80 гадоў. «Невычэрпная энергія і мэтанакіраванасць далі вам магчымасць дасягнуць прафесійных вышынь, увайсці ў гісторыю развіцця тэлебачання як унікальны вядучы папулярных праграм, які адчуває час і свайго гледача», — гаворыцца ў віншаванні. Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што на беларускай зямлі Аляксандра Маслякова ведаюць і любяць як шматгранную асобу, першага вядучага перадачы «Што? Дзе? Калі?» і нязменнага — праграмы «КВЗ».

Сімвал. Удзельнікі Савета дырэктараў нацыянальных кінастудый краін СНД, пасяджэнне якога — у праграме XXVII Мінскага міжнароднага кінафестывалю «Лістапад», наведалі Палац Незалежнасці, інфармуе БелТА. У ліку гасцей былі прадстаўнікі Беларусі, Расіі, Кыргызстана, Таджыкістана, Узбекістана, Грузіі. Іх вітала прэс-сакратар Прэзідэнта Беларусі Наталля Эйсмант, якая і праводзіла экскурсію. Палац Незалежнасці паспеў стаць візіткай Беларусі — у ім увасоблена ўсё тое, на што здольныя беларускія майстры. Ён зроблены рукамі менавіта беларусаў, якія праявілі высокае майстэрства, ствараючы сапраўдныя шэдэўры. Госці даведаліся, што Палац Незалежнасці — кульмінацыйны складнік вялікага сталічнага патрыятычнага квартала, які ў тым ліку ўключае Беларускі дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны.

Ініцыятыва. Саюзная дзяржава ў найбліжэйшыя дні пачне прапрацоўку стварэння медыяхолдынга і інтэрнэт-партала, паведаміў дзяржсакратар Саюзнай дзяржавы Дзмітрый Мезенцаў, выступаючы на беларуска-расійскім экспертна-медыйным форуме «Саюзная дзяржава: інфармацыйная прастора ў лічбавую эпоху», паведамляе БелТА са спасылкай на ТАСС. «Безумоўна, гэта будзе ў тым ліку і інтэрнэт-партал, які зусім не выключае работу з улікам сучасных практык, што робяць нашу інфармацыю даступнай для мільёнаў людзей», — адзначыў Дзмітрый Мезенцаў. Кіраўнік Саюза журналістаў Расіі Уладзімір Салаўёў нагадаў, што 4 лістапада на пасяджэнні Вышэйшага дзяржсавета Саюзнай дзяржавы Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка прапанаваў стварыць медыяхолдынг Саюзнай дзяржавы. «Нам варта падумаць пра тое, як гэта будзе выглядаць, знесці ўсе юрыдычныя перашкоды і загароды», — прапанаваў Уладзімір Салаўёў. Кіраўнік СЖР таксама падкрэсліў, што саюзы журналістаў дзвюх краін цесна ўзаемадзейнічаюць.

Актуаліі. Сітуацыі з бежанцамі на беларуска-польскай граніцы сродкі масавай інфармацыі ўдзяляюць павышаную ўвагу. Журналісты з Беларусі і замежных СМІ днём і ноччу працуюць у ТЛЦ, дзе знаходзяцца бежанцы. Акрамя нацыянальных медыя, акрэдытацыю на граніцы атрымала каля 40 замежных СМІ. Беларускі бок, як і раней, прытрымліваецца агучанай пазіцыі па ўсебаковым асвятленні падзей, што адбываюцца каля граніцы. «Пры гэтым мы бачым, што з польскага боку такой гасціннасці не назіраецца», — выказаў меркаванне першы намеснік міністра інфармацыі Андрэй Кунцэвіч, якога цытуе БелТА. «Ёсць падставы лічыць, што афіцыйная Варшава абмяжоўвае прыезд у Беларусь польскіх журналістаў. Аб гэтым сведчыць той факт, што ні адзін польскі СМІ з тых, што ўжо атрымалі акрэдытацыю для работы ў Беларусі, на граніцы так і не з'явіўся», — падкрэсліў Андрэй Кунцэвіч.

Выстаўка. У Музеі сучаснай беларускай дзяржаўнасці адкрылася выстаўка «Сярэбраны юбілей: 25 гадоў беларускай памятнай манеце», прымеркаваная да выпуску ў абарот першай беларускай памятнай манеты. Яна была прысвечана 50-годдзю Арганізацыі Аб'яднаных Нацый. За 25 гадоў Нацбанкам у рамках серый і аўтаномна было выпушчана больш чым 500 найменняў памятных манет з каштоўных і некаштоўных металаў. Беларускія памятныя манеты добра вядомы ва ўсім свеце і высока ацэнены нумізматычнай супольнасцю. Асноўнымі мэтамі выпуску былі і застаюцца прасоўванне каштоўнасцей беларускай дзяржаўнасці, культурнай і гістарычнай спадчыны беларускага народа, яго дасягненняў, а таксама адлюстраванне найважнейшых падзей у жыцці краіны, падкрэсліваюць у Нацыянальным банку.

Агляд афіцыйных падзей ад Інесы ПЕТРУСЕВІЧ

прэзентацыі

Два таленты на старонках аднаго выдання

Творы і біяграфічныя матэрыялы дзвюх духоўных сясцёр — Цёткі (Алаізы Пашкевіч) і Лесі Украінкі (Ларысы Косач-Квіткі) злучыліся пад адной вокладкай. У Цэнтральнай навуковай бібліятэцы імя Якуба Коласа НАН Беларусі нядаўна прэзентаваны двухмоўны зборнік пад назвай «Акрыленыя родным словам», які выйшаў з друку ў Выдавецкім доме «Звязда» адразу да двух юбілеяў — 145-годдзя з дня нараджэння Цёткі і 150-годдзя Лесі Украінкі.

Фота Кастуся Дробава.

Выданні твораў Алаізы Пашкевіч і Лесі Украінкі розных гадоў.

Вершы беларускай паэтэсы пададзены і на роднай мове, і па-ўкраінску. Вершы ўкраінскай творцы таксама — і ў арыгінале, і ў перакладзе па-беларуску.

Дзве выбітныя асобы, два вялікія таленты аб'ядналіся на старонках кнігі невыпадкова: Алаізу Пашкевіч падтрымлівала ў творчых памкненнях Украіна, у прыватнасці Львоў, а Леся Украінка была звязана з Беларуссю і Мінскам праз лёс каханага чалавека, Сяргея Мяржынскага. Многія беларускія перакладчыкі ў розны час звярталіся да яе твораў.

Ідэя стварэння кнігі належала першаму сакратару Пасольства Украіны ў Рэспубліцы Беларусь Івану Башняку, намесніку старшыні Шчучынскага райвыканкама Алене Пасюце, прафесару, доктару філалагічных навук Вячаславу Рагойшу.

Адбылася літаратурна-музычная імпрэза ў фарматах анлайн і афлайн. Праз *ZOOM* да мерапрыемства далучыліся навучэнцы Астрынскай сярэдняй школы імя Алаізы Пашкевіч. У памяшканні ўстановы працуе адзіны ў Беларусі народны музей у гонар слыннай зямлячкі, экскурсаводы ў якім — вучні. Пад кіраўніцтвам дырэктара музея Алы Балобан юныя аматары падрыхтавалі экскурс у творчасць Цёткі праз яе вершы.

Пра блізкасць гістарычнага шляху, няпросты лёс іх найлепшых дачок і сыноў абодвух народаў разважалі Іван Саверчанка, дырэктар філіяла «Інстытут літаратуразнаўства імя Янкі Купалы» Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі, Галіна Калюжная, старшыня Мінскага гарадскога грамадскага аб'яднання ўкраінцаў «Заповіт», і многія іншыя выступоўцы. У адрас Выдавецкага дома «Звязда» і ўсіх, хто спрычыніўся да выдання кнігі, гучалі словы ўдзячнасці за папулярызацыю культурнай спадчыны класікаў абодвух народаў.

На выстаўцы, арганізаванай у межах імпрэзы, былі прадстаўлены і самыя раннія выданні знакамітых пісьменніц, і сучасныя перавыданні, што захоўваюцца ў фондах ЦНБ імя Якуба Коласа НАН Беларусі. Сярод экспанатаў вылучаліся пераклады некаторых твораў Цёткі і Лесі Украінкі на іншыя мовы, а таксама літаратура аб іх жыцці і даследаванні іх творчасці.

Марыя ЯРАШЭВІЧ

цікава ведаць

Сугучча галасоў

У Мінскім гарадскім тэатры паэзіі пры Цэнтральнай бібліятэцы імя Янкі Купалы адбыўся спектакль «Сугучча галасоў», пастаўлены па сцэнарыі члена Саюза пісьменнікаў Беларусі Кацярыны Стройлавай.

Сваю творчасць на сцэне прадставілі маладыя паэты, члены СПБ Таццяна Купрыянец, Настасся Каратчыкава, Валерыя Ісаковіч, Кацярына Стройлава, кандыдат у члены СПБ Яніна Босак. Вакальныя кампазіцыі выканала выпускніца факультэта міжнародных адносін БДУ Аліна Масалава. Тэматычныя слайды на экране прэзентаваў студэнт Інстытута тэалогіі імя святых Мяфодзія і Кірыла БДУ Уладзіслаў Ісаеў.

Рознае ўспрыманне аўтарамі тэм, якія найбольш часта закранаюцца чытачамі і цікавяць іх, — галоўная мэта імпрэзы. Прыгажосць залатой восені, незабыўнае каханне, трагічная вайна, вялікая сіла жыцця і радасць ад імгненняў нашага існавання — цікава было адчуць уласны погляд удзельнікаў на ўсё гэта.

Завяршыў музычна-паэтычную вечарыну старшыня Мінскага гарадскога аддзялення СПБ дырэктар Мінскага гарадскога тэатра паэзіі Міхась Пазнякоў, які ўручыў памятныя падарункі ўдзельнікам імпрэзы.

Кацярына МІХАЙЛАВА

памяць

Паштоўка з пісьменніцкага архіва

Некалі ствараліся мемарыяльныя камісіі пасля таго, як той ці іншы пісьменнік сыходзіў з жыцця. У выніку іх працы на грамадскіх, зразумела, пачатках прымаліся рашэнні органаў выканаўчай улады, выдаваліся рэкамендацыі па арганізацыі тых ці іншых юбілейных мерапрыемстваў, па выданні Збораў твораў альбо перавыданні Выбраных твораў.

Работа камісій — ці то мемарыяльных, ці то па літаратурнай спадчыне — спрыяла і захаванню пісьменніцкіх архіваў. Сёння, на вялікі жаль, гэтая тэма сышла ці амаль што сыходзіць.

Таму відавочным з'яўляецца вітанне любых ініцыятыў, звязаных з захаваннем напісанага, а таксама эпісталярнай спадчыны, розных дакументальных матэрыялаў. Да мяне трапіла копія паштоўкі Алены Васілевіч (1922—2021) да туркменскага паэта Касыма Нурбадава (1951—2021). Вельмі кароткая і дзелавога характару. Цытую, пераклаўшы на беларускую мову: «Паважаны Касым Нурбадаў! (Прабачце, калі я дапушчу памылкі ў адрасе ці Вашым імя... Дрэнна было чуваць — па тэлефоне...)

Дасылаю Вам замест "Маркулы" — "Партызанку Кнігу" (меней ужо ніяк нельга!). Яна надрукавана нават на персідскай мове.

Віншую Вас і Вашых таварышаў па выдавецтву з Новым годам! Вялікіх поспехаў "Магарыфу"!

Алена Васілевіч».

Такі вось тэкст з выявай на паштоўцы «З Новым годам!» зімовага лесу, з'явы, зусім нязвыклай для Туркменістана, прыйшоў з Мінска да галоўнага рэдактара выдавецтва дзіцячай літаратуры і школьных падручнікаў паэта Касыма Нурбадава. Відавочна, што паштоўцы папярэднічала тэлефонная размова. Хутчэй за ўсё і размова, і паштоўка звязаны з магчымым выданнем твораў Алены Васілевіч у перакладзе на туркменскую мову.

Так склалася, што з жыцця яны, туркменскі паэт і беларуская пісьменніца, пайшлі ў адзін год — у 2021-м: Алена Васілевіч — 8 жніўня, Касым Нурбадаў — 30 красавіка. Ведаю са слоў самога спадара Касыма, што ён ліставаўся з беларускім паэтам Іванам Муравейкам (яшчэ ў 1970-я гады), кантактаваў з дырэктарам выдавецтва «Юнацтва» пісьменнікам Валянцінам Лукшам. Значыць, і ў ашхабадскім архіве Касыма Нурбадава павінны захавацца дакументальныя сведчанні пра гэтыя стасункі.

Раман СЭРВАЧ

круглы стол

Пра кнігі, якія выкрадалі...

Прэзентацыя віртуальнай экспазіцыі «Жыццёвы і творчы шлях Міхася Зарэцкага: да 120-годдзя з дня нараджэння (20.11.1901—29.10.1937)», а таксама абмеркаванне творчасці знакамітага пісьменніка адбылося падчас круглага стала «"Сцежкамі…" Міхася Зарэцкага», прымеркаванага да юбілею творцы, у Нацыянальнай бібліятэцы.

У навуковым пасяджэнні, якое прайшло анлайн і афлайн, узялі ўдзел даследчыкі спадчыны знакамітага пісьменніка, супрацоўнікі архіваў і музеяў, бібліятэк і выдавецтваў.

Адметна, што ў 1920-я гады Міхась Зарэцкі быў адной з самых яркіх літаратурных зорак: яго творы карысталіся шалёным поспехам, бо па-асаблівому ўздзейнічалі на пачуцці чытача. Яго кнігі нават выносілі з бібліятэк, выкрадалі з шафаў, а з іншых выдзіралі найбольш цікавыя старонкі…

Цяпер, калі спадчына пісьменніка ўспрымаецца з адлегласці часу, яна набыла новае гучанне, прачытваецца ў іншым святле, вучоныя знаходзяць у ёй тое, што калісьці было няяўным, не навідавоку: паралелі з творчасцю іншых сусветна вядомых аўтараў, зварот да старажытных традыцый. Так, цікавыя высновы пра літаратурную спадчыну пісьменніка зрабіла Алена Белая, доктар філалагічных навук, прафесар кафедры філалогіі Баранавіцкага дзяржаўнага ўніверсітэта. Яна параўнала творы Міхася Зарэцкага і Джэрома Сэлінджара і ўбачыла ў іх пэўныя агульныя сімвалы. Даследчыца таксама расказала пра выкарыстанне айчынным аўтарам прыёмаў індыйскай паэтыкі, на прыкладах з аповесцей абгрунтавана паказала тое, што сведчыць пра бунтоўны пачатак у творчасці М. Зарэцкага.

Ігар Шаладонаў, кандыдат філалагічных навук, старшы навуковы супрацоўнік Інстытута літаратуразнаўства імя Я. Купалы, сцвярджаў, што ментальныя коды, закладзеныя маладнякоўцамі стагоддзе таму, і сёння жывяць нашу культуру, нацыянальную літаратуру. У гэтым кантэксце літаратуразнаўца параўнаў эстэтычныя канцэпцыі двух аўтараў, якія з'яўляюцца, па сутнасці, супрацьлеглымі: выказванні Міхася Зарэцкага «Чалавек — гэта вір» і Кузьмы Чорнага «Чалавек — гэта цэлы свет». Навукоўца разважаў пра адрозненні ў творчасці аўтараў: калі К. Чорны пайшоў па шляху эпічнасці, псіхалагічнасці і рэалістычнага адлюстравання сучаснасці, то М. Зарэцкі ўспрыняў як аснову творчай рэалізацыі рамантызм.

Фота з сайта Нацыянальнай бібліятэкі.

Падчас пасяджэння круглага стала.

Успамінамі свайго бацькі пра лёс жонкі пісьменніка Марыі падзялілася Алена Майсеенка — дачка Анатоля Майсеенкі, вучонага, даследчыка творчасці Міхася Зарэцкага. З жонкай славутага маладнякоўца ў сям'і літаратуразнаўцы падтрымлівалі сувязь.

Пра шэраг знаходак, звязаных з асобай пісьменніка, у фондах Беларускага дзяржаўнага архіва-музея літаратуры і мастацтва распавёў Віктар Жыбуль — вядучы навуковы супрацоўнік установы, кандыдат філалагічных навук, даследчык літаратуры. Ён прадэманстраваў электронныя копіі некаторых невядомых дагэтуль здымкаў.

Цікавымі былі прэзентацыі і выступленні аб тым, як папулярызуецца асоба і творчасць славутага маладнякоўца. Пра гэта распавядалі Людміла Камароўская, загадчыца аддзела экскурсійна-метадычнай работы Нацыянальнай бібліятэкі, Юлія Амосава, галоўны бібліёграф інфармацыйна-аналітычнага аддзела кніжніцы (зрабіла віртуальную прэзентацыю анлайн-экспазіцыі), а таксама Марына Цімашэнка, загадчыца аддзела маркетынгу Шклоўскай цэнтральнай раённай бібліятэкі.

Віртуальная экспазіцыя створана супрацоўнікамі Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі сумесна з партнёрамі маштабнага праекта «На хвалі часу, у плыні жыцця» (да 100-годдзя літаб'яднання «Маладняк»), што стартаваў яшчэ ў 2019 годзе.

Марыя ЯРАШЭВІЧ

імпрэзы

Карысны дыялог

Гадзіна талерантнасці «Адзінства розных», удзельнікамі якой сталі старшакласнікі сярэдняй школы № 11 г. Ліды, прайшла ў філіяле «Лідская гарадская бібліятэка № 4» раённай бібліятэкі імя Янкі Купалы.

Спецыяліст па сацыяльнай рабоце аддзялення дзённага знаходжання для інвалідаў раённага тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Ірына Лыскоўская звярнула ўвагу моладзі на тое, што часта людзі з інваліднасцю таленавітыя, маюць велізарнае імкненне да жыцця, займаюцца творчасцю і спортам. Сведчанне таму — танец гурта «Рамантыкі» аддзялення дзённага знаходжання для інвалідаў.

Удзельнікам імпрэзы прапанавалі ў гульнявой форме выпрабаваць на сабе цяжар і жыццёвыя нязручнасці людзей з абмежаванымі магчымасцямі. Прысутных пазнаёмілі з тым, якія ўмовы створаны для іх у горадзе. Асаблівую цікавасць выклікала прэзентацыя «Жыць, нягледзячы ні на што». Падрыхтавала яе загадчык філіяла «Лідская гарадская бібліятэка № 4» Любоў Цэслік, яна ж і распавяла пра дасягненні сваіх падапечных.

Гадзіна талерантнасці атрымася інфарматыўнай, а дыялог — цікавым і карысным. Навучэнцы і педагогі задавалі шмат пытанняў, праявілі сапраўдную цікавасць да праблем людзей з абмежаванымі магчымасцямі.

Дар'я МАРЦІНКЕВІЧ

У арт-гасцёўні

Увесь лістапад на Бярэзіншчыне доўжыцца месячнік «Літаратурнае краязнаўства ў асобах». Супрацоўнікі раённай бібліятэкі наладзілі для гасцей з аддзялення дзённага знаходжання для інвалідаў Тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва інклюзіўную арт-гасцёўню «Літаратурныя галасы Бярэзіншчыны».

Перад удзельнікамі імпрэзы як бы паўсталі героі твораў пісьменніка, лаўрэата Нацыянальнай літаратурнай прэміі, уладальніка медаля Францыска Скарыны Міхася Пазнякова, які ў 1970-я гады настаўнічаў на Бярэзіншчыне. Падчас чытацка-тэатралізаванай імпрэзы калектыўна прачыталі найлепшыя творы літаратара, паядननага лёсам з гэтым краем.

Кожны з прысутных мог выступіць у ролі самадзейнага артыста зладжанага літаратурнага прадстаўлення па апавяданнях М. Пазнякова «Вяртанне з фронту», «Клён», «Цукеркі», «Голас», «З новым падыходам». Літаратурная арт-гасцёўня падарыла ўсім прыгажосць мілагучнай беларускай мовы, захапленне цікавымі сюжэтамі, магчымасць праявіць аматарскія здольнасці.

Тамара КРУТАЛЕВІЧ

Беларуская душа паэта

Астравеччына нарадзіла і ўзгадавала шмат таленатаў. Адзін з іх — Станіслаў Валодзька, паэт, член Саюза пісьменнікаў Беларусі. Кожны яго верш, тонкі і шчымлівы, прымушае задумацца над сэнсам жыцця.

Нарадзіўся Станіслаў Валодзька ў невялічкай вёсцы Падольцы. З гэтай нагоды супрацоўніца Падольскай сельскай бібліятэкі Вера Малахвей правяла ў кніжніцы, а пасля і ў мясцовай школе імпрэзу «І з Радзімай нітачка век не абрываецца». Мерапрыемства было насычана добрымі вершамі. Паэзія земляка кранала душы ўсіх прысутных. Вучні мясцовай школы ўважліва слухалі аповед пра жыццёвы шлях творцы, уключаліся ў гутарку і абмеркаванне. У бібліятэцы была падрыхтавана кніжная паліца «Заўжды бярог я ў сэрцы мару...».

Не абмінулі юбілей і ў Астравецкай раённай бібліятэцы, супрацоўнікі якой наведалі гімназію № 1 г. Астраўца і падрыхтавалі для вучняў творчы вечар «Паэт з беларускай душой». Тонка і пранікнёна гучалі вершы аўтара. Дэкламацыя суправаджалася дэманстрацыяй слайдаў з мясцовымі краявідамі.

Мэта любой творчасці — ускалыхнуць чалавечыя сэрцы, прымусіць перагледзець жыццё, стаць бліжэй да вытокаў. Творчасць Станіслава Валодзькі менавіта такая: простая, удумлівая, шчымлівая. А галоўнае — кранае сэрцы...

Вольга ЗАЯНЧКОЎСКАЯ

«ЛіМ»-люстэрка

Беларуска-расійскі навуковы семінар-канферэнцыя «Сучасныя праблемы кніжнай культуры: асноўныя тэндэнцыі і перспектывы развіцця» прайшоў у Дзелавым і культурным комплексе Пасольства Беларусі ў Расіі, паведамляе БелТА. Удзел прынялі вучоныя і вядучыя спецыялісты з акадэмій навук, вышэйшых навучальных устаноў, музеяў, архіваў, бібліятэк Азербайджана, Беларусі, Расіі, Францыі, Чэхіі. На працягу двух дзён абмяркоўвалі вялікую колькасць пытанняў, звязаных з развіццём кніжнай культуры, традыцыямі пісьменства, тэкставай камунікацыяй, гісторыяй кніжных і рукапісных збораў, бытаваннем рэдкіх выданняў. Даклады ўдзельнікаў агучваліся ў анлайн- і афлайн-фарматах. Мерапрыемства традыцыйна праходзіла пад эгідай Міжнароднай асацыяцыі акадэмій навук і яе навуковага савета па кніжнай культуры, кнігавыданні і бібліятэках пры падтрымцы МЗС Беларусі.

Літаратурна-дакументальная экспазіцыя «Залатая раніца беларускага Адраджэння», прысвечаная паэтам і празаікам 1920—1930-х гг., адкрылася ў Дзяржаўным музеі гісторыі беларускай літаратуры. Загадчыца навукова-экспазіцыйнага аддзела музея Вольга Гулева падкрэсліла, што менавіта названыя гады лічацца аднымі з самых яркіх старонак у гісторыі беларускай літаратуры: «Выходзіла шмат кніг, гучалі імёны маладых пісьменнікаў, паэтаў і крытыкаў. Час быў спрыяльны для развіцця нацыянальнай культуры і навукі». Як перадае БелТА, праект рыхтаваўся на працягу года. У экспазіцыі можна ўбачыць вытрымкі з розных выданняў таго часу. Матэрыялы для экспазіцыі — з фондаў музея і Прэзідэнцкай бібліятэкі Рэспублікі Беларусь. Таксама выкарыстаны электронныя копіі часопісаў з фондаў Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі.

Фінал V адкрытага конкурсу аматарскіх турыстычных фільмаў «Падарожнічаем па Сінявокай» пройдзе заўтра ў Талачыне. На фінішным этапе будзе прадстаўлена больш за 50 работ. У фінал кінаспаборніцтва выйшлі 34 удзельнікі з пяці краін — Беларусі, Расіі, Казахстана, Чэхіі, ЗША, інфармуе БелТА. Журы будзе выбіраць пераможцаў у трох намінацыях: найлепшыя турыстычны і краязнаўчы фільмы, а таксама найлепшае слайд-шоу. Агульная тэматыка — хараство Беларусі. Акрамя асноўных намінацый арганізатары плануюць увесці дадатковыя. Запланаваны выстаўка рэтратурыстычнага рыштунку, а таксама фотавыстаўка «Свет вачыма падарожніка», дзе абяруць найбольш яркую і цікавую работу фотааматара.

Выставачны праект «Рафаэль. Эпоха Рэнесанса» адкрыецца 27 лістапада ў Нацыянальным цэнтры сучасных мастацтваў. Як падкрэсліваюць арганізатары, экспазіцыя прадстаўляе самую маштабную рэтраспектыву работ жывапісца Рафаэля Санці і дэманструецца ва Усходняй Еўропе ўпершыню. Гледачы змогуць убачыць больш як 90 гравюр і літаграфій XVI—XIX стагоддзяў з малюнкаў, фрэсак, мазаік прыватных збораў Вялікабрытаніі і Германіі. Акрамя гэтага, будуць прадстаўлены работы з фондаў НЦСМ, а таксама запрошаных беларускіх аўтараў, у ліку якіх — Дзіяна Горбач, Сяргей Гумілеўскі, Алік Замосцін, Павел Кандрусевіч, Лілія Нішчык. Падрыхтавалі для наведвальнікаў і тэматычны квэст, які ўяўляе сабой некалькі заданняў па экспазіцыі. Праект будзе працаваць на пр. Незалежнасці, 47 і працягнецца да 23 студзеня.

Паэтычны зборнік Пятра Мамонава «На шчыльнай зямлі» з прадмовай яго жонкі Вольгі выходзіць у выдавецтве АСТ, гаворыцца на яго сайце. Матэрыялы для кнігі былі перададзены ў выдавецтва Вольгай Мамонавай, з якой вядзецца актыўная работа па апублікаванні і папулярызацыі спадчыны творцы. Зборнік уключае дзве кнігі: у першую ўвайшлі вершы, напісаныя Пятром Мамонавым з ранняга юнацтва і да 2017 года, у другую — творы з 2018-га. Пётр Мамонаў стаў вядомы як рок-музыкант і адзін з заснавальнікаў гурта «Гукі Му». Апроч музычнай творчасці, знакаміты работамі ў тэатры і кіно: сыграў у фільмах «Іголка» (1988), «Таксі-блюз» (1990), «Нага» (1991) ды іншых. «Сёння, як ніколі, відавочна, што творчай спадчыне Пятра Мамонава прызначана месца не толькі на старонках рок-энцыклапедый. Яна папоўніла агульную скарбніцу айчыннай культуры, стаўшы яшчэ адной вечнай гісторыяй — гісторыяй вялікага жыцця ў вялікім мастацтве», — адзначылі ў выдавецтве.

Цікавінкі ад Яўгеніі ШЫЦЬКІ

Служэнне Слову — служэнне Радзіме

За апошнія пяць гадоў Магілёўская абласная пісьменніцкая арганізацыя зрабіла значны крок наперад. Наладжаны моцныя сувязі з вертыкаллю ўлады, дзяржаўнымі і грамадскімі арганізацыямі вобласці. Значна павялічылася колькасць мерапрыемстваў, якія праводзяцца пісьменнікамі і з іх удзелам. Узрасла іх якасць і значнасць у грамадска-палітычным жыцці рэгіёна. Слова пісьменніка гучыць у школах, вышэйшых і сярэдніх навучальных установах, установах культуры, на прадпрыемствах як у абласным цэнтры, так і ў раёнах вобласці.

Дзень беларускага пісьменства. Бялынічы, 2020 г.

Жыццё пісьменніцкай арганізацыі рэгулярна адлюстроўваецца ў сродках масавай інфармацыі і на інтэрнэт-рэсурсах. У абласной грамадска-палітычнай газеце «Магілёўскія ведамасці» штомесяц друкуецца літаратурная старонка аддзялення «Натхненне»: знаёмім чытачоў не толькі з нашымі найлепшымі літаратурнымі набыткамі, але і з найважнейшымі падзеямі ў жыцці пісьменніцкай арганізацыі.

Разам з інфармацыйным агенцтвам «Магілёўскія ведамасці» рыхтуем і выдаём літаратурны альманах «Прыдняпроўе. Магілёўшчына літаратурная». Чарговы нумар выйшаў з друку ў кастрычніку бягучага года.

Уласна аддзяленнем і пры яго непасрэдным удзеле было праведзена больш за 40 літаратурных конкурсаў. Сярод іх — конкурсы памяці Канстанціна Сіманава «Это нужно — не мертвым! Это надо — живым!», дзіцячай і юнацкай творчасці «На пачатку дарог», прысвечаны 90-годдзю У. Караткевіча, «І кружыцца планета Куляшова», конкурс аўтарскага чытання вершаў «Не вырывай страницы памяти», «Под Рождественским небом», «Вялікай Перамозе — 75!» і іншыя.

На базе МДУ імя А. А. Куляшова штогод праходзяць Куляшоўскія чытанні і Міжнародныя «Романовские чтения», а ў абласной бібліятэцы імя У. І. Леніна — Пысінскія чытанні.

Візітоўкай літаратурнай Магілёўшчыны сталі фестываль «Пісьмянкоў луг», міжнародная патрыятычная акцыя, прысвечаная памяці Канстанціна Сіманава і іншыя. Мы працуем не толькі ў сваім рэгіёне, але выходзім і на рэспубліканскі і міжнародны ўзроўні, дзе таксама гучаць творы магілёўскіх пісьменнікаў, выдаюцца кнігі, праводзіцца значная работа па развіцці і збліжэнні культур славянскіх народаў.

Мінулае пяцігоддзе было вельмі шчодрым на падзеі, найважнейшай з якіх для нас стаў чарговы пленум Саюза пісьменнікаў Саюзнай дзяржавы, што адбыўся ў Магілёве 3—4 кастрычніка 2019 года. Прыняты шэраг значных дакументаў, сярод якіх «Заява Пленума Саюза пісьменнікаў Саюзнай дзяржавы "Аб процістаянні" фашызму і спробах скажэння гісторыі», «Зварот да кіраўніцтва Нацыянальнага саюза пісьменнікаў Украіны». Актуальнасць іх, праверана часам, відавочная і сёння. І, вядома ж, найважная падзея — Дзень беларускага пісьменства, які прайшоў на вельмі высокім арганізацыйным узроўні ў Бялынічах у 2020 годзе і стаў яскравым паказчыкам актуальнасці і глыбіні беларускай мовы, літаратуры і культуры ў цэлым. А ў бягучым годзе творцы Саюза пісьменнікаў Беларусі зноў сустрэліся на гасціннай магілёўскай зямлі. Гэтым разам — на свяце «Александрыя збірае сяброў», дзе сваімі выступленнямі, сваёй творчасцю чарговы раз яскрава паказалі, што мы, беларусы, — адзіны народ!

Пісьменнікі аддзялення плённа працуюць у прозе (Алена Кісель, Наталля Ніканчук, Алёна Беланожка), паэзіі (Уладзімір Ясеў, Віктар Кунцэвіч, Валянціна Габрусева, Наталля Міхальчук), публіцыстыцы (Аляксандр Косцераў, Надзея Драбышэўская, Уладзімір Харланцьеў). Развіваецца кірунак дзіцячай літаратуры, які ў аддзяленні прадстаўляе таленавітая Жанна Міус (Усцінава). У гэтым годзе да яе далучылася маладая пісьменніца Галіна Пярун, якая прынята ў Саюз пісьменнікаў Беларусі ў верасні. Кірунак сатыры і гумару прадстаўляюць ветэраны нашай пісьменніцкай суполкі Міхаіл Уласенка і Мікалай Падабед. Апошнія гады актывізавалася дзейнасць па перакладах твораў з іншых моў. У гэтым дапамагае наша цеснае супрацоўніцтва з міжнародным праектам «Берега дружбы».

Імпрэзы і творчасць нашых пісьменнікаў папулярызуюцца ў сацыяльных сетках на старонках «ВКонтакте» і «Фэйсбук», на сайтах Саюза пісьменнікаў Беларусі, Магілёўскага абласнога выканаўчага камітэта, абласных і рэспубліканскіх сродкаў масавай інфармацыі. Нашы асноўныя інтэрнэт-праекты: «Нашчадкі Перамогі» (аўтары аддзялення і падпісчыкі старонак дзеляцца ўспамінамі пра сваіх продкаў — удзельнікі ВАВ); «#пісьменнікі_МААСПБ» (спасылкі на творы нашых аўтараў, якія ёсць у адкрытым доступе ў інтэрнэце); «Спытай пісьменніка» (цыкл дыстанцыйных інтэрв'ю з аўтарамі МААСПБ); «Больш крытыкі» (акцыя-конкурс з размяшчэннем у адкрытым доступе твора магілёўскага аўтара і запрашэннем чытачоў да напісання водгукаў і рэцэнзій) і іншыя. Пісьменнікі аддзялення рэгулярна ўдзельнічаюць у рэспубліканскіх і абласных тэлевізійных праектах.

На сёння Магілёўскае абласное аддзяленне ГА «Саюз пісьменнікаў Беларусі» налічвае 39 чалавек. За апошнія 5 гадоў нашы рады папоўнілі 12 пісьменнікаў. Значна ўзраслі патрабаванні да якасці твораў кандыдатаў у члены Саюза пісьменнікаў Беларусі. З гэтай мэтай, а таксама для аналізу творчасці іншых літаратараў Магілёўшчыны па прадстаўленні органаў дзяржаўнай улады і іншых арганізацый у аддзяленні створаны экспертны савет, у які ўвайшлі нашы выбітныя пісьменнікі, а таксама навукоўцы-літаратуразнаўцы Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. А. Куляшова. Для павышэння літаратурнай граматнасці пісьменнікаў і маладых творцаў, якія жадаюць звязаць свой лёс з творчасцю, на базе Магілёўскай абласной бібліятэкі імя У. І. Леніна створана літаратурная гасцёўня «Магія слова», яе вядзе член савета аддзялення, кандыдат філалагічных навук Алена Кісель. У барацьбе за якасць літаратуры мы усё больш абапіраемся на навуковы патэнцыял МДУ імя А. А. Куляшова, у чым вельмі спрыяе член савета аддзялення кандыдата палітычных навук Уладзімір Ясеў.

Нельга не адзначыць павышэнне ролі пісьменніцкай арганізацыі ў культурным жыцці рэгіёна. Гэта спектаклі, літаратурныя і літаратурна-музычныя пастаноўкі, песні на творы аўтараў — пісьменнікаў нашага аддзялення, сцэнарыі і тэксты для гарадскіх і абласных мерапрыемстваў. Значнай падзеяй у культурным жыцці вобласці стала літаратурна-музычная пастаноўка паэмы «Марыйка», зробленая навучэнцамі Магілёўскага дзяржаўнага каледжа мастацтваў — удзельнікамі тэатральнай студыі «Отражение» (кіраўнік Алена Ярашук). Гэтая пастаноўка пачала свой шлях з галоўнай пляцоўкі Свята беларускага пісьменства ў г. Бялынічы, прадоўжыла яго на сцэне Дома літаратара ў Мінску і зараз гучыць і, мы ўпэўнены, доўга будзе гучаць з падмосткаў Магілёўскага драматычнага тэатра, у навучальных установах, на іншых канцэртных пляцоўках нашай вобласці і краіны. Варта таксама адзначыць мюзікл Алёны Беланожкі «Вянок на вадзе», прэм'ера якога адбылася на свяце «Александрыя збірае сяброў» у бягучым годзе. Гэта прыгожыя і загадкавыя гісторыі пра пошукі кахання і шчасця.

Візітоўкай літаратурнай Магілёўшчыны сталі фестываль «Пісьмянкоў луг», міжнародная патрыятычная акцыя, прысвечаная памяці Канстанціна Сіманава і іншыя. Мы працуем не толькі ў сваім рэгіёне, але выходзім і на рэспубліканскі і міжнародны ўзроўні, дзе таксама гучаць творы магілёўскіх пісьменнікаў, выдаюцца кнігі, праводзіцца значная работа па развіцці і збліжэнні культур славянскіх народаў.

Дзень роднай мовы ў абласной бібліятэцы.

Можна шмат гаварыць пра станоўчае ў Магілёўскім абласным аддзяленні Саюза пісьменнікаў Беларусі, але, лічу, самае галоўнае, дзякуючы чаму здолелі так плённа працаваць у гэты перыяд, — тое, што мы змаглі аб'яднаць пісьменнікаў аддзялення, стварыць суполку актыўных творчых паплечнікаў-аднадумцаў, гатовых аддаваць усе свае сілы служэнню Слову, служэнню Радзіме.

Алесь КАЗЕКА,
старшыня Магілёўскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі

Пракладваць сумесную дарогу

У самым пачатку цырымоніі адкрыцця «Лістапада» была ўручана спецыяльная ўзнагарода Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «За захаванне і развіццё традыцый і духоўнасці ў кінамастацтве». Прэмію атрымаў майстар айчыннай анімацыі, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі Ігар Волчак.

— Усе намаганні былі б абсалютна бескарысныя, калі б не наш цудоўны калектыў — студыя анімацыйных фільмаў і тыя людзі, якія дапамагалі мне рабіць іх, — адзначыў творца. — Я прыйшоў на «Беларусьфільм» 53 гады таму. Мне вельмі пашанцавала, бо гэта было світанне беларускага кінематографа. Цяпер сам нясу гэтую эстафету і перадаю яе маладым. Жадаю ад усёй душы, каб моладзь праявіла сябе, каб здымаліся цудоўныя фільмы, каб мы маглі ганарыцца створаным і атрымліваць такія прызы.

Фота БелТА.

Падчас адкрыцця кінафестывалю «Лістапад».

Доўгачаканым госцем цырымоніі адкрыцця стаў народны артыст Расіі Мікалай Бурляеў. Акцёр, рэжысёр, грамадскі дзеяч, заснавальнік форуму «Залаты Віцязь» нагадаў аб непарушных духоўных сувязях славянскай культурнай прасторы, прачытаў верш Фёдара Цютчава «Пасланне славянам».

— Я вельмі рады, што мы зноў тут пасля доўгіх гадоў расстання, — падкрэсліў творца. — 27 гадоў разам пракладалі сумесную дарогу. Быў перыяд, калі «Лістапад» стаў больш глядзець на Захад, але, прайшоўшы пэўны шлях, зноў вярнуўся да сваіх духоўных асноў. Для мяне гэта пераломны момант. Сёння мы не цікавыя Захаду, а цікавыя толькі адно аднаму. Мы павінны арыентавацца на высокую, адзіную і непадзельную культуру Русі. На фільмы, якія здымалі Тураў, Пташук, Міхалкоў ды іншыя выдатныя беларускія і расійскія майстры. Цяпер, калі каштоўнасці нашага хрысціянскага свету аказаліся пад пагрозай, веру, што «Лістапад» пойдзе правільнай дарогай і будзе сцвярджаць высокія маральныя ідэалы. Час збіраць камяні і разам ствараць цудоўныя фільмы.

Фестываль сапраўды часта адчуваў на сабе шмат змен. Без іх не абышлося і ў 2021-м. Так, пасаду старшыні заняў народны артыст Беларусі Аляксандр Яфрэмаў. Падчас адкрыцця яму выпала правесці рытуал — разбіць талерку з аўтографамі ўдзельнікаў мінулых гадоў. У прывітальным слове Аляксандр Яфрэмаў успомніў пра Расціслава Янкоўскага, які доўгі час быў старшынёй фестывалю і ствараў атмасферу адзінства, аб якой зараз кажуць арганізатары 27-га «Лістапада».

— У кінафоруму сапраўды выдатны слоган, што актуальна ў наш бурны час, з улікам аспектаў, звязаных з пандэміяй, — адзначыў намеснік прэм'ер-міністра Ігар Петрышэнка. — Мы хочам, каб дзякуючы фестывалю людзі сталі яшчэ дабрэйшыя. Ёсць розныя традыцыі, культуры, але існуе адно, што аб'ядноўвае, — імкненне жыць у згодзе, сяброўстве і камфорце. Каб творчы складнік быў накіраваны на стварэнне, а сімфонія кіно аб'ядноўвала, каб было менш розных супярэчнасцей, войн, канфліктаў. Менавіта мастацтву павінна несці людзям праўду. Дакументалістыцы трэба адлюстроўваць аб'ектыўную рэальнасць, глядач павінен бачыць і ведаць, што і як адбывалася.

Падчас адкрыцця арганізатары прэзентавалі гасцям фестывалю і творчыя выступленні. Напрыклад, са сцэны «Масквы» прагучала песня з тэлесерыяла Валерыя Тадароўскага «Адліга» ў выкананні Аляксандры Гайдук і Руслана Чарнецкага. Выступіў арт-гурт «Беларусы».

Фільмам адкрыцця «Лістапада» стала «Каралеўская гульня» Шцёльцля Філіпа (Германія, Аўстрыя). Аснова сюжэта — «Шахматная навела» Стэфана Цвейга, дзеянне якой адбываецца ў Вене 1938 года. Па парадзе сябра юрыст Ёзэф Бартак разам з жонкай плануе тэрмінова пакінуць акупаваную нацыстамі Аўстрыю, аднак яго арыштоўвае гестапа. І пасля адмовы выдаць паліцыі канфідэнцыяльную інфармацыю пра кліентаў мужчыну пазбаўляюць сувязі са знешнім светам. Але аднойчы Ёзэфу ўдаецца ўкрасці кнігу пра шахматы, з якой пачынаецца самае галоўнае...

Сёлета ў праграме іграваога кіно 13 фільмаў: кінастужкі з Расіі, Францыі, Ірана, Узбекістана, Кітая, Венесуэлы і іншых краін. Сярод намінантаў — франка-іранская карціна Асгара Фархадзі «Герой», якая была адзначана Гран-пры журы Канскага фестывалю. На вялікім экране паказалі і ўзбекскую ваенную драму «Ілхак» Жахангіра Ахмедава, знятую ў Беларусі. Кінастужка «Дзень мёртвых» расійскага рэжысёра Віктара Рыжакова распавядае пра адносіны пакаленняў, але з нязвыклых ракурсаў. Таксама ў праграме іграваога кіно — «Мая ноч» Антуанеты Була (Францыя, Бельгія), «Вуліца» На Джазія (Кітай), «Сем маленькіх супадзенняў» Петэра Готара (Венгрыя, Румынія), «Рака» Гасана Салаба (Ліван, Францыя, Катар, Германія), «Агонь» Айжан Касымбек (Казахстан) і іншыя. Журы ўзначальвае расійскі рэжысёр і прадзюсар Рэнат Даўляцьяраў.

Дакументальнае кіно прадстаўлена 17 фільмамі: за рэдкім выключэннем усе яны сёлета ўжо пабывалі на фестывалях. Прэм'ернымі можна назваць два фільмы: беларускі «Страла» Галіны Адамовіч — пра ўдзельніц фальклорнага калектыву з вёскі Стаўбун на Гомельшчыне і расійскі «Іншым я ўжо не буду» Антона Нікалаева, створаны да 75-годдзя Мікалая Бурляева. Старшыня журы — Наталля Марынава, дырэктар тэлеканала «Беларусь 3».

Найбольшы па колькасці фільмаў конкурс «Кіно маладых»: на прызы прэтэндуюць 22 стужкі, пераважна дэбютныя. Беларусь прадстаўлена 8-хвілінным фільмам «Дарога» Кірыла Халецкага, які ўжо атрымаў шэраг узнагарод на айчынных і міжнародных кінафестывалях. Журы «Кіно маладых» узначальвае расійскі рэжысёр і прадзюсар Аляксей Цяльноў.

У змест праграмы пазаконкурснага кіно ўвайшоў блок «Беларуская анімацыя XXI стагоддзя» («Паданне пра Гадзіву» Ірыны Кадзюковай, «Беларускія прымаўкі» Міхаіла Тумелі, «Дзед» Аляксандра Ленкіна, «Лыжка для салдата» Ірыны Тарасавай, «Паданне пра гуслі» Таццяны Кубліцкай, «Цацка» Рыты Шаграй, «Лагодны воўк» Наталлі Дарвінай), рэтраспектыва грузінскага кіно, а таксама паказ ваеннай драмы Віктара Турава «Праз могілкі», франка-бельгійскага дэтэктыўнага трылера «Чорная скрыня», стужкі «Вар'яцкае кіно для дарослых» Раду Жудэ — сёлетняга пераможцы Берлінскага фестывалю. І гэта далёка не ўвесь пералік…

А пакуль асэнсоўваем убачанае і чакаем вынікаў!

Яўгенія ШЫЦЬКА

Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.

Паяднаныя кінаэпохі

Паводле традыцыі, якая бярэ свой пачатак у 1998 годзе, паралельна старэйшаму фестывалю «Лістапад» у мінскіх кінатэатрах праводзіцца яго «мініяцюрная» версія пад назвай «Лістападзік». Адкрыццё сёлетняга конкурсу фільмаў для дзіцячай і юнацкай аўдыторыі прайшло ў кінатэатры «Піянер» раніцай 20 лістапада.

Мерапрыемства праходзіла ў антуражы школьнага свята. Тэатралізаванае дзейства з удзелам дзяцей рознага ўзросту, роставых лялек, якія выяўлялі персанажаў вядомых беларускіх мультфільмаў, нагадвала вераснёўскую лінейку. З затуханнем святла і апусканнем цемры на глядзельную залу цэлая група маленькіх выступоўцаў сцэны перад кінаэкранам абрынула на гледачоў усю моц свайго нястрымнага многагалосся. Шумны і стракаты гурт адзін за адным выканаў некалькі песенна-танцавальных нумароў, якія ілюстрыравалі найбольш яркія моманты з гісторыі анімацыі і кінематографа нашай краіны. Талісманам конкурсу стаў Светлячок са знакамітага мультфільма, выпушчанага кінастудыяй «Беларусьфільм» у 1978 годзе. Хлопчык у адмысловай шапцы і з ліхтаром у руцэ, паўтараючы сюжэт класічнай стужкі, спачатку запальваў сімвалічныя агеньчыкі свята, а потым пры хуткім набліжэнні кінапаказу загасіў іх усе да апошняга. Тым самым гледачам быў дадзены недвухсэнсоўны намёк, чаго чакаць далей.

Аднак спачатку слова ўзялі прысутныя на цырымоніі афіцыйныя асобы. Намеснік міністра культуры Валерый Грамада ў прамове зрабіў акцэнт на значэнні фестывальнага слогана «Кіно — сімфонія адзінства» і яго сувязі з абвяшчэннем 2021 года ў Беларусі Годам народнага адзінства. Намеснік старшыні Мінгарвыканкама Арцём Цуран выказаў падзяку стваральнікам іграваых і мультыплікацыйных стужак, прадстаўленых у конкурсе, згадаў уласнае дзяцінства. Дырэктар Нацыянальнай кінастудыі «Беларусьфільм» Уладзімір Карачэўскі на правах арганізатара фестывалю абвясціў «Лістападзік» адкрытым ды пажадаў усім яго гасцям і членам журы прыемнага прагляду.

Пасля некалькіх спецыяльных нумароў і кульмінацыйнага выбуху канфеці святло ў зале згасла і па экране забегалі рознакаляровыя карцінкі — пачаўся фільм адкрыцця «Зоркі сёмага неба». Анімацыйны мюзікл, створаны рэжысёрам Аленай Туравай на студыі «Беларусьфільм», стаў першай поўнаметражнай мультыплікацыйнай стужкай у гісторыі беларускага кіно, яму і адкрываць галоўны дзіцячы кінафестываль краіны. Сюжэт апавядае аб трох героях, якім наканавана выратаваць свет ад хуткай пагібелі і вярнуць зоркі на небасхіл.

Старшынёй журы конкурсу была прызначана Ірына Шаўчук, заслужаная артыстка УССР, заслужаная артыстка Расійскай Федэрацыі, віцэ-прэзідэнт адкрытага фестывалю кіно краін СНД і Балтыі «Кінашок». У выстаўленні ацэнак ёй дапамагалі Хатуна Хундадзэ, рэжысёр і прадзюсар, заснавальнік і дырэктар Міжнароднага фестывалю кароткаметражнага і горнага кіно ў Местыі, а таксама Аляксандр Ленкін, беларускі рэжысёр анімацыйнага кіно. Акрамя прафесійнага журы, конкурсныя работы ацэньвала яшчэ і другое, не менш аўтарытэтнае, — савет юных кінакрытыкаў. Ды самі гледачы, вядома ж. Сістэму глядацкага галасавання ніхто не адмяняў…

Фота БелТА.

Талісман «Лістападзіка» — Светлячок.

Новая дырэкцыя фестывалю пераставіла акцэнты ў пазіцыянаванні «Лістападзіка». Апошнія гады конкурс фільмаў для дзіцячай і юнацкай аўдыторыі больш канцэнтраваўся на аўдыторыі менавіта другога ўзроўню або, па меншай меры, сямейнай. Нярэдка здаралася так, што карціны, прадстаўленыя ў рамках конкурсу, хаця і былі прысвечаны праблемам дзяцей, усё ж прызначаліся дарослым і ўяўляліся спробамі сур'ёзна пагутарыць на важныя і складаныя тэмы. Сёлета арганізатары, як відаць, цэлілі ў дзіцячую аўдыторыю, прапануючы стужкі, якія маглі б зацікавіць менавіта маленькага гледача.

Цырымонія закрыцця прайшла таксама ў кінатэатры «Піянер» — 23 лістапада. Падрабязней аб выніках, узнагародах і найбольш прыкметных карцінах пагаворым пазней, у адным з найбліжэйшых нумароў. Абмяркоўваць ёсць што...

Мікіта КІСЯЛЁЎ

«…Дзе хацелі прарэзацца крылы»

Надзвычай узрадаваў лістападаўскі нумар «Полымя» прозай: разнапланавая і шматтэмная, яна задаволіць густ самага патрабавальнага чытача. Два апавяданні Віктара Гардзея — «Ратунак ад самоты» і «Свацця баба Лізавета», — напісаныя багатай сакавітай мовай, як экскурс углыб беларускай ментальнасці, душы, з аднаго боку схільнай да самоты і пошукаў чагосьці невытлумачальнага, што знаходзіцца па-за межамі ўсіх спазнаных сэнсаў і разумення, а з іншага — хітраватай і спрактыкаванай, пра якія гавораць сабе наўме. Неад'емная характарыстыка прозы Віктара Гардзея — адметная іронія, незласлівая, як дарагі напой, настоеная на аўтарскім светабачанні. Расповеды, дзе няма выразна акрэсленага сюжэту і актыўнага дзеяння, тым не менш, выразна раскрываюць лірычную асобу галоўнага героя, у якой угадваецца сам аўтар: «Над галавой, як быццам нічога і не здарылася, весела міргаюць зоркі, поўня з жоўтай стала серабрыстай і скацілася за Каменку ўбок, зрэшты, нябесныя свяцілы мяне зусім не цікавяць: у роспачныя хвіліны чалавек занадта пануры й маўклівы. Прычынай таму — мая адзінота і юнацкая наіўнасць, але ратунку ад самоты не бывае, у чым можна было ўпэўніцца не адзін раз. Ды пры ўсёй рызыкоўнасці сваёй натуры я адчуваю прыкрасць і віну, што зрабіў камусьці блага, няхай і незнарок, а выпадкова…»

Арыгінальна, нечакана рэалізаваў задуму Іван Штэйнер. Сама назва твора «*Delirium*» (што ў перакладзе з латыні — вар'яцтва, памяшальніцтва) і яго аўтарскае вызначэнне як «Псіхадэлічная гісторыя з элементамі дэтэктыва», якая пачынаецца з дакладной запіскі і пратакола абследавання аб'екта, што ўтрымлівае словы інспектара: «Адзін я туды больш не пайду: здароўе даражэй…», інтрыгуе сходу, напружанне паступова ўзрастае… Гісторыя магла б быць прачытана за адзін вечар, але яе працягу, а потым і завяршэння давядзецца чакаць не адзін месяц — у часопісе толькі пачатак… Іван Штэйнер застаецца верны сабе: гіпертэкстуальнасць, іскрамётны гумар, інтэлектуалізм…

Апавяданне Алены Брава пад назвай «Дзяўчаткі на даху», здавалася б, магло расказаць пра нешта вясёлае ці злёгку небяспечнае з разраду дзіцячых свавольстваў, але гэта памылковая «наводка». У цэнтры аповеду — самотная, хворая, балесная асоба з параненай душой, непражытым горам страты. Асабліва заслугоўвае ўвагі аўтарскі прыём, праз які пісьменніца выводзіць увагу на гераіню твора: «Некалькі радкоў пра лёгкую дзявочую постаць зачапіліся за жалезны борт эпохі, якая прайшла, захаваліся, хоць папера пажоўкла і выцвіла чарніла. Ці прайшла разам з эпохай Ганна? У маім нататніку яна так і стаіць на бальнічным калідоры каля адчыненага акна, туга зацягнуўшы на таліі паясок казённага баёвага халата, і над яе галавой узлятае і ападае белая празрыстая фіранка»…

Эса дэ Кейрош — аўтар апавядання «Скарб», з якім знаёміць рубрыка «Галасы свету» — адзін з самых выбітных прадстаўнікоў партугальскай літаратуры. Твор яго, перастораны з партугальскай мовы па-беларуску Рыгорам Ляшуком, мае прыхаваную алегорыю: тры браты, тры ключы ад куфра з золатам (у якім насамрэч хаваецца лёс кожнага з братоў), тры ўчынкі і адпаведная адплата кожнаму…

У рубрыцы «Паэзія» выступілі аўтары Алесь Бадак з падборкай «Нічога не знікае» (у якой асабліва моцным з'яўляецца верш «Усяслаў Чарадзей» — асоба старажытнага князя, нягледзячы на аддаленасць у часе, атрымалася надзіва блізкай і зразумелай: «Слухае іх Усяслаў Чарадзей // Кожнае слова дае яму сілы. // І на спіне крыватоўсць радзей // там, дзе хацелі прарэзацца крылы»); Святлана Якубоўская (падборка «З дабрынёй у змове» не пазбаўлена арыгінальных маляўнічых метафар: «У далонях вясны закіпае чаромха», «Вабяць ландышы зноў белазубай усмешкай») і Станіслаў Валодзька (нізка «Спяшаюся пакланіцца»).

Вартыя ўвагі і публікацыі ў іншых рубрыках часопіса. Так, Адам Глобус згадвае Алеся Разанава, Тамара Аўсяннікава разважае над лістамі Яўгеніі Янішчыц да Сяргея Панізьніка, Людміла Рублеўская распавядае гісторыі кахання Гальяша Леўчыка, Уладзіміра Жылкі, Язэпа Пушчы, Аркадзя Куляшова і Яўгеніі Пфляўмбаўм, адлюстраваныя ў іх вершах…

Тадора ШПІЛЬКА

Зімовы сон жыцця

Жыццё, здаецца, доўгае, а расказаць пра яго амаль і няма чаго. Такая думка круцілася ў галаве гераіні аднаго з апавяданняў Алены Паповай, надрукаваных у новым нумары «Нёмана». Але ці не схільны кожны з нас, незалежна ад узросту, да такіх несуцяшальных роздумаў, ці не апаноўваюць гэтыя горкія пачуцці ў самы непадыходзячы момант, калі час дзейнічаць, ствараць, шукаць? А тут яшчэ гэтая зіма…

Аднак не будзем адхіляцца. Увага — на Алену Папову з яе апавяданнямі з цыкла «Сны жыцця». Лейтматыў прозы — неўладкаванасць жыцця ўсё таго ж маленькага чалавека, які, прайшоўшы дарогу цалкам ці напалову, паспеў задумацца пра сябе толькі раз-два, заняты клопатам аб шчасці блізкіх і родных. «Неяк азірнулася Ада на сваё жыццё, а ў ім — адна праца, — піша Алена Папова пра ўжо згаданую гераіню. — Кватэрка-маламерка, з якой дваццаць пяць гадоў бруд выграбала, заводскі цэх, заводскі двор, заводская сцяна — шэрая, маркотная, без канца, без краю… Ідзеш міма яе іншы раз, ідзеш, ногі цягнеш, крокі лічыш, вечнасць… І раптам цесна стала Адзе ў сваім жыцці, моташна стала, сумна… І дні ў яе пачаліся цьмяныя, цесныя, сумныя… Як быццам ужо і не жыла Ада, а проста несла сваё цела па абрыдлым дням ад панядзелка да суботы». Здаецца, чыталі пра падобнае шмат разоў, але тэкст пабудаваны так, што крочыш побач: сумняваешся, спадзяваешся і адмаўляешся ад такой рэчаіснасці. У цэнтры трох гісторый пісьменніцы — жаночыя лёсы Старой, Аўсянкінай і Ады, а таксама пабочных гераінь. Аўтар паказвае, як несвоечасовая (калі можна ў гэтым выпадку ўжыць такі прыметнік) страта можа зламаць чалавека, спыніць жывы механізм жыцця. Алене Паповай удаецца паказаць не толькі ўнутраны стан персанажаў, але і навакольнае асяроддзе. У малой прозе гэта надзвычай каштоўна.

«Два апавяданні» прапануе Ліна Мрагі. Першага пад назвай «Негабарытны груз» дастаткова, каб зразумець, што аўтар — непапраўны аптыміст і, магчыма, рамантык. Кожны складнік твора сведчыць пра пэўную меладраматычнасць сюжэта з ноткамі непраўдападобнасці ды ідэалізаванасці: ад галоўнага героя астранаўта Скота Ліна з яго запозненай і, як падаецца, не зусім зразумелай чытачу сумленнасцю да маментальнага выканання волі нябожчыка-бацькі. Справядлівасць перамагае, каханне знаходзіцца, зло адолена — і ўсё гэта за перыяд менш чым суткі. Прытым сам герой у гэты час нічым асаблівым не займаецца і ўвогуле незразумела, што яго чакала ў рэальным жыцці. Але Ліна Мрагі сумняваецца не дае: і жылі яны доўга і шчасліва.

Паэзія гэтым разам прадстаўлена падборкамі «Не знайду ніколі на пытанні адказу я…» Міколы Мятліцкага ў перакладзе Юрыя Шчарбакова, «Прачнецца радасць на белым свеце…» Таццяны Лейкі і «З мінулага ў будучыню…» Святланы Быкавай. Адзіны мужчынскі погляд мастацкай часткі нумара прадстаўлены вершамі «Бурка», «Вілія», «Галубоўская», «Тут, у Полацку, плынь гадоў напеўная…», «Зноў купальская ноч…», якія могуць стаць любімымі для аматараў творчасці Міколы Мятліцкага.

Яўгенія ШЫЦЬКА

Паміж будучыняй і мінуўшчынай

Упроцівагу натуральнаму парадку рэчаў аўтары лістападаўскага нумара часопіса «Маладосць» заўтра чакаюць адлігу, а зусім не першага снегу, як можна было б падумаць. Ды не проста чакаюць — літаральна прагнуць. Халоднай часінай пісьменнікі і пісьменніцы жадаюць цяпла, а таксама «нябёсаў таямніцу разгадаць» і зліцца з наваколлем у дзіўным танцы. Шмат чаго хацелі б яны, але па іроніі лёсу ніяк не могуць атрымаць жаданага… Шчымлівым пачуццём фрустрацыі прасякнуты радкі большасці твораў у лістападаўскай падборцы.

Свежая «Маладосць» адкрываецца невялічкім фантастычным эсэ Яны Цэглы «Тварожнае Возера». У ім безыменная пара («стомленая акторка і занадта паспяховы махляр») на скрадзеным караблі ляціць праз

касмічную прастору да планеты Тварожнае Возера. Ляціць, каб забыцца, каб пачаць жыццё наноў і растварыцца ў сусвеце, застацца ў рэшце рэшт сам-насам. Наперадзе ж іх чакае яшчэ некалькі дзён маруднага палёту. Эскізнасць, неапрацаванасць, нават незавершанасць твора, што выяўляецца тут і там, нівеліруюцца надзвычайнай шчырасцю, якая проста абяззбройвае і, трэба заўважыць, вельмі падкупляе.

Карціну дапаўняюць размешчаныя далей вершы Аксаны Гаджыў з тымі ж праблемамі, але з тымі ж прыкладна і «заслугамі». Чытаючы гэтыя творы, чарговы раз пераконваешся, што менавіта ў падобных тэкстах, тэкстах маладых аўтараў (далёка не заўсёды ўмелых, але затое прагных да творчасці), тэкстах у чымсьці недасканалых, ды затое не паточных і не збітых, нярэдка трапляюцца сапраўдныя перліны, чый вясёлы бляск ёсць адлюстраванне ўсёй глыбіні мастацкага таленту таго ці іншага маладога творцы.

Адной з такіх яркіх перлінак дакладна можна лічыць апошнія радкі фантасмагорыі Аксаны Гаджыў «На Уздзвіжанне». Лірычны герой пасылае ў неба такую просьбу: «Падступны прарок, танцуй са мной! // Давай замарудзім кадр. // І я адкажу сваёй галавой // За гэты святы макабр». І толькі паглядзіце, якім злавесным, але моцным аксюмаранам завяршае аўтар сваё выступленне. Ух, ажно дрыжыкі пабеглі!

Падборку працягвае Віктар Шніп з фрагментамі дзённікавага рамана «Заўтра была адліга», знаёмага ў тым ліку і чытачам газеты «Літаратура і мастацтва». Пісьменнік дзеліцца некаторымі асабліва мудрымі назіраннямі са свайго жыцця, напрыклад: «Калі ты нешта прайграў, дык гэта не значыць, што ты слабак. Проста той, хто выйграў, крыху мацнейшы за цябе на дадзены момант. Вось і ўсё». Ёсць у рамане і больш цікавыя думкі.

Навум Гальпяровіч уласнымі вершамі сцвярджае галоўную ідэю лістападаўскага нумара «Маладосці» аб тым, што «просіцца патрэба <…> пачуць душой, пра што нам шэпча неба». Маргарыта Латышкевіч у сваю чаргу працягвае ўжо ўмацаваную традыцыю жыццяпісаў на старонках часопіса, прапануючы чытачам прафесійна скроеную біяграфічную аповесць пра Яна Баршчэўскага «Цень крыжа на каляінах». Завяршаюць літаратурную частку нумара вершы Алесі Цэван, Кацярыны Мізеры і проза маленькіх форм ад Георгія Марчука, Івана Мелава і Наталлі Ніканчук. Апошняе апавяданне «Гульназ» асабліва звяртае на сябе ўвагу мноствам слэнгавай лексікі і інтэрнэт-тэрміналогіі.

Мікіта ШЧАРБАКОЎ

Падарожжа ў іншае вымярэнне

Старажытныя замкі і зачараваныя рэчы, гістарычныя персанажы і патаемныя мясціны, перанясенне ў іншы час, прывіды з таго свету і пярэваратні-ваўкалакі, ведзьмары — ці магчыма апісаць усё, на што здольна фантазія пісьменніка Лаўрэна Юрагі?..

Нядаўна пабачыла свет кніга Лаўрэна Юрагі «Замак з люстраной залай» (2021, Выдавецкі дом «Звязда»). Вельмі сімвалічна, што час яе выдання супаў з 30-гадовым юбілеем стварэння Юрагам першага паўнафарматнага апавядання «Партрэт» (1991), якое было надрукавана ў 1992 годзе ў часопісе «Маладосць» (у кнізе яно выйшла пад назвай «Партрэтыст ад д'ябла»). Такое супадзенне гаворыць пра доўгі шлях кнігі да чытача, але разам з тым можна ўявіць, наколькі першыя творы аўтара за гэты час былі дапрацаваны і палепшаны.

У «Замку з люстраной залай» вы не знойдзеце прадмовы ці пасляслоўя, якія б больш паведамілі пра самога аўтара. Каб зразумець глыбіню ўсяго, пра што расказвае Лаўрэн Юрага, трэба больш даведацца пра яго. Тады стане зразумелай сувязь аўтара з гісторыяй, знаёмства з архіўнымі, рэдкімі выданнямі, якія вяртаюць нас у самую глыбіню стагоддзяў.

Лаўрэн Юрага (Юрый Мікалаевіч Лаўрык) — бібліятэкар, кнігазнаўца, навуковец. Працуе ў Нацыянальным гістарычным музеі, даследчык старажытных і рэдкіх дакументаў. Вучыўся ў Люблінскім каталіцкім універсітэце, дзе атрымаў навуковае званне магістра тэалогіі, дадаткова вывучаў гісторыю.

Пачынаў аўтар свой творчы шлях у 1990-я з невялікіх абразкоў «Касмічны эцюд» і «Здань», якія выйшлі ў газеце «Кнігарня» і часопісе «Маладосць». Апавяданні Лаўрэна Юрагі друкаваліся ў часопісах «Маладосць» «Калосьсе», «Акно». Разам з навуковымі артыкуламі, даследаваннямі кніжнай спадчыны нашай краіны пісаў ён і мастацкія творы, таму так доўга не магла выйсці яго першая мастацкая кніга.

Часопіс «Маладосць» у свой час назваў Лаўрэна Юрагу «творцам гістарычных стылізацый», які не проста ідзе пратаптанымі сцежкамі вялікай колькасці пісьменнікаў гістарычнага жанру, што сёння займае значнае месца ў прыгожым пісьменстве. Ён шукае сваю дарогу, якой стаў зварот да архаічнай мовы, але ж яго мова стылізаваная, падобная да старажытнай. Як гаворыць сам пісьменнік, яна павінна быць зразумелай чытачу. Некаторыя складаныя словы ў кнізе Юрага тлумачыць: «лічына», «канверсаваць», «пратэстацыя», «прынцыпал», «дэлінквент», «галаўшчына». Большасць з растлумачаных слоў — тэрміны, якія цяпер не выкарыстоўваюцца. Але сустракаюцца словы, якія перадаюць звыклы нам сэнс, аднак у кнізе гучаць паіншаму: *бабця, пісьмёны, сяйво, здрайца, мніх*. І гэтаму ёсць тлумачэнне.

Вось што распавядае пісьменнік: «Задача аўтара гістарычнай прозы не ў пісанні на тагачаснай гаворцы — ён проста павінен так «прышчапіць» даўнія словы да галінкі сучаснай беларускай мовы, каб яны на ёй закрасавалі».

«Замак з люстраной залай» складаецца з Кнігі праклёнаў, Кнігі ваўкоў і Кнігі здарэнняў. У гэтай сістэме апавяданні як малюнкі далучаюцца адно да аднаго, непажадана парушаць іх паслядоўнасць, таму і чытаць неабходна кожны твор адзін за адным. На выбар траістай сістэмы з назвамі асобных кніг зборніка паўплывалі любімыя аўтарам кнігі Хорхе Луіса Борхеса — аргенцінскага пісьменніка першай паловы XX стагоддзя, які ў невялікіх празаічных фантазіях выказваў развагі на філасофскія праблемы, і часта яны прымалі форму прыгодніцкіх ці дэтэктыўных гісторый. Несумненна, за аснову назваў цыклаў кнігі Лаўрэн Юрага ўзяў назвы кніг Борхеса «Книга песка» ці «Книга ада и рая» (складальнікі — Х. Л. Борхес, А. Б'ой Касарэс).

Назву кнігі «Замак з люстраной залай» неабходна ўспрымаць не як гістарычную архітэктурную каштоўнасць, элемент готыкі і падзей мінулых стагоддзяў, а як люстраную сувязь паміж усімі апавяданнямі кнігі. Яна нагадвае сабой стужку Мёбіуса, дзе назіраюцца паўторы і пераклічка паміж героямі: раздзелы адпавядаюць адзін аднаму ў розных кнігах. Напрыклад, раздзел «Людзі» Кнігі праклёнаў перагукаецца ў стужцы з раздзелам «Твары» Кнігі здарэнняў. У цэнтры,

як у стужцы, павінна быць паўтарэнне падзей і герояў, але яны не ідэнтычныя, хутчэй сутыкаюцца, адлюстроўваючы і пераламляючы адно аднаго як у люстэрку.

Стыль аўтара фарміраваўся з першага апавядання. Пры напісанні «Партрэта» складвалася разуменне таго, што зацікавіць чытача можа нечаканая развязка падзей. Гэта дало Лаўрэну Юрагу магчымасць інтрыгаваць і трымаць у напружанні, а ў канцы твора — здзівіць нечаканым завяршэннем. Увагу чытача прыцягваюць непрадказальныя элементы, асабліва ў канцы твора, дзякуючы якім ствараецца эфект падманутага чакання. Такія развязкі сустракаюцца ў большасці твораў, уражваюць канцоўкі апавяданняў «Праклён святара», «Вада́р», «Шкляная прызма» і інш.

Героямі апавяданняў з'яўляюцца гістарычныя асобы, якія жылі ў Вялікім Княстве Літоўскім: Кашпар Эйсымонт, Пацей Тышковіч, Валерыян Сакалоўскі. Аўтар знаходзіў старажытныя дакументы, з якіх браў цікавыя факты, што клаліся ў аснову апавядання. І каб надаць гэтым фактам подых рэальнасці, ён выкарыстоўваў асобныя выпадкі з уласнага жыцця. Такімі творамі сталі апавяданні «Манускрыпт», «Сямісвечнік», «Сыгнет», «Крыся», «Корд», «Родавае гняздо», «Шкляная прызма». І гэта гаворыць аб тым, як глыбока аўтар пераасэнсоўвае свае асабістыя падзеі, што навяваюць пэўныя малюнкі, раскрываюць жаданні герояў. Правобразам асобных персанажаў нярэдка выступае сам аўтар, толькі некаторыя эпізоды ці падзеі жыцця зменены творчай фантазіяй.

Захапляе апавяданне «Сыгнет» — вобразы духаў, прывідаў, якія спажываюць энергію людзей. Сыгнет валодаў такой моцай, што даваў магчымасць адганяць злыя сілы, «*несці людзям дабро*». Але ў што такім чынам магло ператварыцца жыццё ўладальніка пярсцёнка, які карыстаўся яго сілай і дапамагаў людзям? Вось што піша аўтар у апавяданні: «Я закінуў вучобу, перастаў бачыцца з сябрамі, расстаўся з Чэсяй… а ўсё ж аднойчы спыніўся, дарэшты высмактаны бясконцай і безвыніковай барацьбой».

Веды навукоўца, кнігазнаўцы далі магчымасць Лаўрэну Юрагу ўбачыць у сабе пісьменніка. У адной асобе спляліся навуковыя веды і творчая фантазія, што даюць аснову для апрацоўкі гістарычных фактаў, падзей даўняга мінулага. У аснове апавяданняў «Манускрыпт», «Кашпар Эйсымонт», «Воўк і Тур», «Сыгнет» старажытныя рукапісы, манускрыпты, пра якія піша пісьменнік. У апавяданні «Манускрыпт» выдатна падкрэслены веды аўтара: «Вось нарэшце табе ўдалося адгарнуць першы аркуш рукапісу, і ўжо можна бачыць дробныя шыўкі, якімі злучаны між сабой кавалкі пергаменту. Тэкст занатаваны квадратным габрэйскім пісьмом, і таму манускрыпт папярэдне атрыбутаваны як "Тора", то-бок біблейскае "Пяцікніжжа"...».

Ці магчыма такія апавяданні адрасаваць юнаму чытачу? Хіба толькі начытанаму, абазнанаму ў гісторыі, бо многія тэксты складаныя для разумення. Тая сістэма і глыбіня закранутых гістарычных падзей іншы раз застаецца завуаляванай, таму адразу цяжка зразумець, якую ідэю даносіць пісьменнік.

Што ж, застаецца толькі пажадаць аўтару і далей ісці сцяжынкай, якую ён абраў, бо творы Лаўрэна Юрагі пакідаюць непаўторнае ўражанне.

Таццяна АРЦЮХОВА

Ці патрэбна памятаць?

Серыя кароткіх апавяданняў-успамінаў Ніны Мацявілы «Водблескі майго дзяцінства» («Отсветы моего детства»), што пабачыла свет у «Нёмане» (2020, № 2), на першы погляд, распавядае аб простых прыкметах жыцця звычайнага хутара ў перадваеннай Заходняй Беларусі. Але ж наша памяць нездарма захоўвае выявы прадметаў, людскія постаці, нязначныя, здавалася б, падзеі — бо ёсць у тым асаблівы сэнс...

Вось персанажы-рэчы: яны сапраўды немудрагелістыя, але аўтар згадвае іх з вялікай пяшчотай. Найважнейшай у сялянскім ладзе жыцця была, вядома ж, Печ — добрая ахоўніца Дома: «Она кормила, согревала и объединяла семью...» Радкі, прысвечаныя ёй, і самі нібы сагрэтыя тым добрым цяплом. Усялякія іншыя прасы ды куфары таксама ажываюць — маюць уласцівы ім характар і гісторыю. Адчуць душу кожнай рэчы і маляўніча распавесці пра яе жыццё выдатна ўмеў, як вядома, датчанін Андэрсен. І вось спрабуе гэта наша беларуская пісьменніца. Нават сучаснае дзіця цывілізацыі, якое ўзгадавана на наймаднейшых гаджэтах, знойдзе нешта цікавае ў той старажытнай экзотыцы...

Людзі на хутары шмат і цяжка працавалі. Адной з найцяжэйшых прац быў, напрыклад, абмалот зерня. Галоўнае тут — стаўленне да справы: ці то настаўніцкі стол з кіпаю сшыткаў, ці станок з ЛПК. Для тых людзей праца і жыццё былі непадзельныя.

...Тое нялёгкае жыццё падзяляла з гаспадарамі свойскія жывёлы, і стаўленне да іх было як да добрых памочнікаў: гаспадары клапаціліся аб іх сапраўдных патрэбах. У сялянскіх дзяцей догляд жывёлы ператварыўся ў ласкавыя зносіны з жывой душой. З малога ўзросту дзеці былі навучаны дапамагаць дарослым, і малыя ўспрымалі тое «не в тягость, а в радость».

Калі скончана была праца ў полі і на гародзе, надыходзіла пара адпачынку. Для бацькі адпачынак быў у тым, што ён дзеля пабочнага заробку шыў па заказе «ўсё і для ўсіх» і, зразумела, для ўласнай сям'і: ад верхняй вопраткі да пасцельнай бялізны. Па сутнасці, ён змяняў адну працу на іншую, адносна лягчэйшую. Для жанчын, дзяўчат і дзяўчынак адпачынкам было рукадзелле. Навучаць дзяўчынак пачыналі рана — гадоў з пяці. Спачатку найбольш простаму — накшталт ажурнай мярэжкі для аздаблення насовак.

Ручная праца забяспечвала амаль усе побытавыя патрэбы, бо крамнае каштавала вельмі дорага, а іншы раз было й недасягальна. Аднак мелася і няяўная звышзадача: яна непрыкметна, без наўмысных павучанняў выхоўвала ўседлівасць, цярплівасць, адказнасць, звычку спадзявацца на свае магчымасці, эстэтычны густ — і нават спрыяла творчасці. А творчасць, аднойчы абудзіўшыся ў чалавеку, найчасцей застаецца з ім на ўсё жыццё...

Даўнішняя прымаўка нездарма сцвярджае, што «праздность — мать всех пороков», у тым ліку суму, тугі, пачуцця ўласнай недарэчнасці, злосці на ўвесь свет. Чалавек народжаны, каб рабіць, ствараць, здзяйсняць — вось такая ідэя вымалёўваецца пры чытанні.

Адкуль бралася памкненне да прыгажосці ў тым суровым і сціплым побыце? Вясковы кравец павінен быў валодаць мудрагелістай навукай — задаволіць кліента, у якога сціплыя сродкі і жаданне выглядаць годна. Пад «годна» разумелася не толькі дыхтоўна, але і прыгожа.

Старанна працуючы для сваіх кліентаў, майстар і сам быў выключна ахайны: нават каб працаваць у полі, не апранаў падраную вопратку.

Выхаванне дзяцей адбывалася не толькі натуральным чынам — падчас працы. Бацькі ўніверсітэтаў не канчалі — але ж яны дакладна адчувалі, калі патрэбна іх умяшальніцтва. Вельмі адметны ў гэтым сэнсе аповед «Вішнёвая смала». Дзяўчынка засаромелася перад шыкоўна апранутымі гасцямі сваёй сяброўкі Ліды з-за яе старой сукенкі і не далучыла яе да гульні... Ёсць у тым караценькім аповедзе не адзін урок. Дзіцячая далонька з кавалачкам вішнёвай смалы — гэта сімвал і найвыразнейшая выява Дараванння: без яго няма ні сяброўства, ні любові...

Гістарычныя падзеі і факты пададзены ў аповедах з непасрэднасцю дзіцячага светабачання на жыццё, без аніякіх асабістых меркаванняў, і таму яны яшчэ больш выразныя.

Адно з даволі распаўсюджаных уяўленняў — шчаснае і заможнае жыццё ў перадваеннай Заходняй Беларусі. Сям'я Ніны, безумоўна, не адносілася да бядноты — але ж толькі дзякуючы несупыннай упартай працы. Аднак той драўляны дом, збудаваны маладзёнамі з дапамогай сваякоў, быў крыты самай таннай саломай. Сістэма аховы здароўя не блішчэла... Вельмі выразны такі факт: у бацькоў было пяцёра дзяцей, але засталася жыць толькі Ніна...

Прайшло шмат гадоў, але мінулае, «дорогое и сокровенное», моцна трымае аўтара аповедаў. Адкуль тыя пяшчота і жаль, калі ў мінулым было нямала і цяжкага, і сумнага? І калі жыццё, якое надышло пасля, сталася больш камфортным, быццам лягчэйшым і цікавейшым? А гэта значыць, што было ў тым жыцці нешта сапраўднае і каштоўнае, на што не трэба забывацца і што так патрэбна цяпер.

Алена ЧЫЖЭЎСКАЯ



Уладзімір БАБКОЎ

Успамін

Ля капуснага поля за садам —
Халадок вераснёўскай расы…
А душа па-хлапечаму рада:
Я — палёў зачарованы сын,
І дзяцінства зусім недалёка,
Яно побач наяве —
не ў сне,
Бо сланечнік з нядрэмным вокам
Пакланіўся, пазнаўшы мяне…
Нібы дзеці,
загорнуты з ласкай
Качаны ў сто лістоў для цяпла…
І так соладка
верыцца ў казку —
«Мама сына ў капусце знайшла…»

Курган чытае Барадуліна

Далонь на сэрца па-славянску —
Ад вобразаў і сам расчулены,
Па радыё рэспубліканскім
Курган чытае Барадуліна.
Радкі, бы крылы жураўліныя,
Ускалыхваюць эфір нябачны
Над аўдавелаю Радзімаю,
Над ссірацелымі Ушачамі…
Святлее край над далягляданмі,
Спытай слязу скупую:
— Скуль яна?
Дабрэе свет, калі па радыё
Курган чытае Барадуліна…

Пра грошы

Час ёсць грошы,
Час ёсць грошы, —
Так сцвярджаецца здавён.
Ды не купіш і за грошы
Тых пражытых вамі дзён.
Не купіць і міг адзіны
І за «зелені» мільён…
Ён праплыў, растаў ільдзінай…
Недзе знік учора ён.

* * *

…Туман начуе ў стозе адсырэлым.
І ледзьве зорка пачынае маладзіцца,
ён прачынаецца, і, занач сцежалелы,
І шэры да ракі брыдзе памыцца.
То берага прыглушыць галасы,
То гладзіць хвалі даланёй ласкава,
То падоўгу раніцай вісіць
Яго адзенне на кустах і травах.

* * *

Чмель торкаецца сонна ў канюшыну —
Цяжкі ад нектару згубіўся выпадкова,
Глядзяцца зорачкі заспаныя з вышыняў
У рэчкі пачарнелую падкову,
Звон каласоў чуваць
Яшчэ не зжатых.
Калі камбайны сціхлі —
Стомлены быў дзень.
І больш ні гуку…
Толькі час ад часу
Зямля здрыгнецца —
Яблык упадзе.

* * *

У цісках чужой віны
І ў цісках чужой бяды
Без даўгоў жыў-быў я доўга —
Набіраў у рот вады…
Чый — дзе?
Ведаў берагі,
За сяброў вяртаў даўгі,
Падстаўляў я шыю-грыву,
Па лязе ступаў, абрыве...
Рады быў за іх, шчаслівых.
А калі задоўжаў сам —
Пачарнела паласа…
Паласнула без нажа:
Клікаць стаў мной ратаваных,
Толькі кліч знік у тумане,
А далёка ў акіяне
Конь мой, тонучы, іржаў…

Іван КАПЫЛОВІЧ

* * *

На прастор выбягае дарога —
Падуладная ёй далячынь.
Не стрымацца — нясуць быстра ногі
Да Палесся — кутка дарагога,
Дзе сябе я ад скрухі лячыў.

Няхай холад, вятры штармавыя
Усяго працінаюць наскрозь,
Будуць вабіць мясціны святыя,
Дзе матывы гучаць не чужыя —
Там блукаў сярод пушчаў і рос.

Там паўсюль запаветныя месцы —
Невядомай дарогай ішоў
Да вяршыні,
дзе сонца смяецца,
Цішыня дзе на сэрца кладзецца
Спавядальнаю, светлай імшой.

На гару падымуся крутую:
Будзе Прыпяць мне добра відна.
І ўсім сэрцам раптоўна адчую,
Што ў прастору гляджу і святкую —
Што хацець шчэ ад гэтага дня?

Упаду прад усім на калені —
Буду Бога прасіць аб адным:
Да апошняга ўздыху, імгнення
Не пакіне няхай утрапенне,
Што ад явы прыходзіць у сны.

* * *

Сярод пушчаў, балот
Нарадзіўся я, рос.
Там я зведаў узлёт
Часам радасці, слёз.

Там блукаў між бяроз,
Між узгоркаў, далін
І натхняўся мой лёс
Духам казак, былін.

Слухаў я галасы,
Што ішлі з вышыні.
Не цураўся красы
Ў свае смутныя дні.

Фота Кастуся Дробава.

Маіх думак абсяг —
Ён без меры, мяжы:
Ранак дня і працяг
На крутым віражы.

Я прайду вёрстаў шмат —
Згледжу продкаў сляды.
Буду стрымана рад:
Забываў нелады.

* * *

Буду ісці тым прасёлкам,
Што борам, гаем пралёг.
Дум перадумаю колькі
Часам бясконцых дарог.

Думы мае — летуценні,
Мройная ява і сны,
Хуткага часу імгненні —
Далі без іх не відны.

Буду ісці скрозь туманы,
Скрозь вечнасць буду ісці.
Напрамкам, думкай сатканым,
Душу дзе знайду адвясці.

Дзе духу ёсць наталенне,
Воля не знае мяжы,
Мрояў узлёт, акрыленне
Парою без ценю імжы.

Буду ісці тым прасёлкам,
Забываю дзе нелады,
Дзе не патрачу без толку
Веку свайго дні, гады.

Марына ПОМАЗ-ЛАЙКОВА

* * *

А. Сысу

Вернецца ўсё да асноў, да вытокаў,
Зноўку адродзіцца тое, што маем…
Хто правядзе мяне
ў вырай далёкі?
Мама…
Коцяцца пацеркі па абрусе,
Ім на шаўковай вяровачцы цесна.
А ў мацярынскіх руках Беларусі
Затрапяталася новая песня.

* * *

І. Талькову

Пачуўся стрэл.
Свет пахіснуўся.
Натоўп… грымёрка… дым здаля…
Туман… гудзенне… рэха пульсу…
А што пасля?
Маўчыць зямля…

Разгон злавеснай каляснiцы
Не прыпыніць, не адмяніць.
Ды трэба ж некаму рашыцца
Стаць на шляху,
бяду спыніць!
І выйшаў ён. Не мог іначай.
Луналі песні над людзьмі…
Тады чаму ж ты,
восень, плачаш
Лістоты горкімі слязьмі?
Бо не ў зямны спакой сыходзіў,
У неба адлятаў паэт...
Сумлення віцязь адыходзіў
Сцяжынкай зорнай у Сусвет!

Цыганка

Летні поўдзень лёг на схілы,
Цішыня ў лагчынах спіць.
Пад блакітным небасхілам
Брычка лёгкая рыпіць.

То пагорак, то палянка.
Жыта спелае ў палях…
Правіць брычкаю цыганка,
За плячыма —
доўгі шлях…
Шлях спатканняў,
шлях блуканняў,
Звонкіх песень,
горкіх слёз,
Шлях бурлівых стрэч,
расстанняў…
Што ж,
такі цыганскі лёс!

І каханне, нібы вецер,
Прамільгнула праз гады…
Ну, а потым нават дзеці
Разбрыліся хто куды…

То пагорак,
то палянка,
То развілка трох дарог…
Ты куды цяпер,
цыганка?
Дзе ж твой шлях?
Пакажа Бог!

Пераклад з рускай
Генадзя АЎЛАСЕНКІ

Жыццёвыя радасці

Апавяданні

Васіль НАЙДЗІН

Латарэйны білет

Спачатку на дзядка ніхто не звярнуў увагі. Ён зайшоў у ашчадкасу нетаропка, прыпыняючыся — так звычайна робяць старыя. Абвёў позіркам акенцы. Ад найбліжэйшага мужчына-кліент, па ўсім відаць, збіраўся адыходзіць… Крышку паразважаўшы, дзядок пры дапамозе свайго кійка накіраваўся туды.

— Зноў ветэран! Працы ці чаго там яшчэ… — Голас жанчыны ў чарзе быў непрыветны: — Развялося… Чарга, парадак — што ім да гэтага, бяры нахрапам. Жыццё навучыла…

— Здаецца, інвалід. Закон ёсць закон, — выказаўся грамадзянін яўна не пенсійнага узросту.

Большасць жа людзей у чарзе маўчала.

Незадаволеная жанчына прыўзняла галаву і чарговы раз паглядзела на электронны гадзіннік, які на сцяне паказваў-адлічваў не толькі гадзіны з мінутамі, але і секунды:

— Усе спяшаюцца, усім гарыць… Але ж у старых ёсць час. Прысядзьце, адпачніце. Вунь мяккія крэслы, нават канапа. Хоць ты самой кладзіся…

Той-сёй у чарзе ўсміхнуўся.

Дзядок тым часам ужо ледзь не закрываў сваёй амаль лысай галавой акенца пад нумарам «1»:

— Дачушка! Тры латарэйныя білеты мне, калі ласка… Толькі не тыя, што за шклом…

Дзяўчына за акенцам паглядзела па баках і прыўзнялася са свайго рабочага месца:

— Не разумею вас, грамадзянін… Вось «пяцёрачка», а гэта спартыўная…

— Святочная трэба, навагодняя. Летась мне вельмі пашанцавала… У першым акенцы браў, вашым, добра памятаю. І не я выбіраў…

— Прабачце, я тут працую нядаўна… Але сёння ніяк не магу вас парадаваць: навагодні выпуск да нас яшчэ не паступаў.

— А я чытаў…

— Ну, паведамілі хутчэй, чым нам даставілі. Давядзецца пачакаць.

— Зноў трэба ісці да вас…

— Ой, гэтыя старыя! — працягвала хвалявацца ўсё тая ж мажная жанчына, пазіраючы на гадзіннік.

— Не кажыце, — падмагала ёй ужо і суседка ў чарзе. — Латарэя яму трэба! Сядзеў бы дзе-небудзь… у закуточку.

— Уседзіць ён табе! Жонцы вялікая радасць, відаць, што з хаты на гадзіну-другую сышоў. Нацэліла, выперла…

— Старая сама разбагацець дзесьці хоча, — незласліва ўсміхнуўся мужчына, які, здаецца, нікуды не спяшаўся.

Дзядок з акуратнай бародкай не спяшаўся адыходзіць ад акенца:

— Заўтра, дачушка, сустрэнемся… з вашага дазволу. Што іх аддрукавалі — факт… Навагодні выпуск самы надзейны. І сусед так кажа. Ён аднойчы спінінг выйграў. Гадоў дзесяць назад.

— Заходзьце, прыходзьце… Можаце і з суседам. Будзем рады.

— Мне ж летась з тэлевізарам пашанцавала, а раптам зараз — машына!..

Дзяўчына-аператар усміхнулася і пачала аглядаць чаргу ў зале, быццам просячы ў яе прабачэння. За невялікую затрымку, не па яе віне.

А чаргу ўжо прарвала.

— Бачылі вы яго!.. «Мерседэс» дзед захацеў, — адарваўся ад свайго планшэта пажылы мужчына ў акулярах. Паклаў у кішэню мабільнік і яго сусед. Цішыні ранейшай ужо не было.

— Дурнеюць цяперака і старыя, і маладыя…

— І ўсім хочацца што-небудзь хапнуць на дармавінку. Каб бац — і ўсё маеш, ты кароль.

— А вы чулі, нядаўна адзін вязунчык, дарэчы, халасцяк, амаль чатыры мільёны рублёў у «Спортлато» выйграй. Гэта ж два мільёны долараў!

— Чыстая праўда. Ён адразу веласіпед купіў.

— Ачомаецца, накупляе «мерседэсаў», «лексусаў». Сабе, каханкам…

— Перайначыліся людзі… Ой, што робіцца! Раней гудка паравоза баяліся, нават рыпу колаў калёс, а зараз транспартам найлепшым прызнаюць толькі самалёты! Ды не абы-якія, а ў люксавым варыянце. І каб за некалькі гадзін панскага лёту апынуцца на якіх-небудзь цёплых Канарах ці нават яшчэ далей.

— Нахрапістымі парабіліся! Тысячы ўжо для іх не грошы, мільёны падавай…

Дзядуля тым часам узяў кіёк пад паху, вызваліўшы тым самым абедзве рукі, і пачаў хаваць у кішэню грошы.

— Пра самалёты не будзем. Але навошта вам машына? — напаўсур'ёз спытала адна з жанчын, каля якой блізка быў дзядок.

— Відаць, старой надакучыла сядзець каля разбітага карыта, — пажартаваў ужо смела і яшчэ нехта ў чарзе.

— Няма ў мяне старой, памерла, — узняў дзядуля вочы на таго, хто ўсміхаўся.

— Дзеці патрабуюць?.. Цягнулі б і цягнулі з гэтых пенсіянераў.

— І дзяцей няма. А таму і ўнукаў нямашака.

— Дык навошта вам машына? — у голасе мажнай жанчыны была ўжо шчырая зацікаўленасць. — Грошай у вас зашмат, відаць… каб потым рамантаваць яе? Пасля чарговай аварыі. Мой муж расказаў бы вам, колькі каштуе гэтая справа…

— Не ў грашах справа. Хапае іх, — вочы дзядулі яшчэ больш ажывіліся. — Пенсія ж невялікая, але жыву без гора. Кватэрка ёсць. І тэлевізар — на паўсцяны. Пашанцавала, выйграў. Але і ранейшы добра працаваў. Я яго суседу ўдружыў.

— Значыць, засталося адно — машына!

— Ды не ў ёй справа, — усміхнуўся дзядуля. І, адчуўшы, што яго слухаюць, працягваў: — Куплю я, значыць, білет, альбо нават тры — і чакаю… Чакаю раніцу, каб прыйшоў знаёмы паштальён. Мабыць, ён прынясе газету, у якой надрукавана табліца. Будзе прычына пайсці да суседа. Разам пачнём правяраць білеты. А раптам пашанцуе, як у той раз — сыдуцца і нумар, і серыя!.. Э-э, састарыцеся, зразумееце. Калі чалавек чакае каго-небудзь або чаго-небудзь — яму весялей. Тады ён жыве, жыве з надзеяй… Ну, я пайшоў… Далей жыць.

Венікі

Сяргей даўно марыў схадзіць з бацькам у гарадскую лазню. Але Раман Ігнатавіч, прыязджаючы ў госці да сына, толькі ўсміхаўся:

— Ды што я, лазні не бачыў! Ці даўно мыўся… У вёсцы ў мяне парылка лепшая. Шкада, часу ў цябе заўсёды не хапае, каб адсцёбаць венічкам як трэба сябе, унука, ды і бацьку заадно.

— Не хвалюйся, калі-небудзь адсцёбаю. Я не паспею, унук падрастае.

— Не сумняваюся…

— Я сур'ёзна, тата. Тут жа лазня з басейнам, масажык зробім. Яшчэ што-небудзь прыдумаем. Там такі буфет!

— Які ўжо нам масаж! Не тыя косці, каб іх гнулі… І наліха мне басейн! У рачулцы любіў і зараз спрабую купацца, непадалёку ж…

— І ўзімку, у халадэчу?!

— Ды колькі той зімы, — жартаваў Ігнатавіч. — Ты мне, сынуля, горад пакажы. Тут у вас не па месяцах-гадах, а па гадзінах усё мяняецца. Дамы-прыгажуны як грыбы растуць, усюды чысціня, парадак. Во, на атракцыёнах пакатай. Каб мы з унукам, як у той раз, круціліся — галава ўнізе, а ногі ледзь не чапляюць верхавіны дрэў. Толькі бабам не кажы…

— Усё што пажадаеш, тата, зробім. На гэты раз праграма будзе вялікая.

Сяргей на сваёй прыгожай інамарцы вазіў бацьку па горадзе. Ездзілі і ў гарадскім транспарце. Каталіся з ім у парку на «Халі-галі», іншых «суперах». Хадзілі ў цырк. Былі на выстаўцы сабак. А на катоў і птушак ужо і сіл не хапіла.

Раман Ігнатавіч папрасіў даць яму адзін дзень «адгулу». Каб адпачыць, прыйсці ў сябе.

— А ўсё ж у лазню схадзіць трэба, — не здаваўся Сяргей.

Бацька ўжо не адмекваўся. Ён згадваў, як любяць рабіць людзі сталага ўзросту.

— Ты яшчэ, сынку, пад стол хадзіў, а яна ўжо стаяла за гумном гатовенькая. Безумоўна, з бярвёнаў, пад мох — па ўсіх правілах. Летась і камяні памяняў, яны «змарыліся», цяпло дрэнна трымалі. З электраправодкай, асвятленнем разабраўся. Прыязджайце, павяду.

— Не тое, тата. Тут выскокваеш з парылкі і ў басейн — бултых.

— Задурыў ты мне галаву гэтымі «бултыхамі». Я з венічкам больш люблю… Мяккім, духмяным. Сваёй вытворчасці. Ды каб без падганяйлаў. Адлуплю сябе і сяджу потым доўга на сваім цёплым венічку. Любата!

— Будзе і венік. Іх каля лазні прадаюць — колькі хочаш і з чаго пажадаеш. Бярозавыя, дубовыя і нават з елак.

— А з шыпшыны не знойдзем?..

Раман Ігнатавіч усміхнуўся і нарэшце здаўся:

— Ладна, паехалі… Ці пехадралам будзем дабірацца? Гэта яшчэ лепш…

Нявестка хутка сабрала розныя там мыла-мачалкі, ручнікі і — лёгкай вам, мужыкі, пары.

— Каб ведаў, прыхапіў бы свой венічак, — разважаў дарогай бацька. — Удаліся яны ў мяне сёлета. І летась нядрэнныя былі, хоць крыху і перасушыў…

— Тут гэтага дабра — хоць воз бяры. За грошы, канечне.

— Во-во, за грошы. А на продаж заўсёды робяць не так, як для сябе. Абы ўсабачыць. Ведаю я гэтых гарадскіх майстроў-вязальшчыкаў. Ім адно ў галаве — гані манету!

— Безумоўна, такі час… Месяц назад у дзядка купляў — прыемны чалавек. І венік нармальны.

— Бываюць выключэнні. Магчыма, і нам сёння пашанцуе… Я вось нядаўна чытаў парады аднаго разумнага чалавека, прафесара ці доктара: вязаць для лазні венікі з галін дрэў, якія растуць каля дарог, а тым больш у горадзе — гібельная справа…

Сяргей ведаў бацькаў характар, яго гаварлівасць па асобных тэмах, нават дробязных, таму не перабіваў. Няхай выгаварыцца, такой бяды.

— …Думаеш, любыя дубцы звяжы, і гатова? Дудкі! Не паспее лісце распусціцца, а яны ўжо ламаць-вязаць. А сушаць як?! Каб дзе жарчэй. На паддашку трэба, у цяньку. Ды каб ветрык гуляў…

Каля лазні сапраўды прадаваліся венікі. Але выбар быў невялікі.

Чалавек з няголеным і непрыветным тварам (да «дзядка» яму было яшчэ далёка-далёка) паказаў рукой на лаўку, дзе быў раскладзены «тавар». І з вялікага меха тырчэлі рознай таўшчыні ручкі венікаў.

— Пр-рашу!..

Сяргей ужо памкнуўся ўзяць верхні венік, як яго спыніў бацька.

— Ану дай я выберу… І па якой яны ў вас цане?

— За пяцёрачку — адна штука, — без усялякіх эмоцый паведаміў няголены.

— Што-о-о? — шчыра здзівіўся Раман Ігнатавіч. — За адзін венік пяць рублёў?!.

— Калі два — просім восем, — паказаў жоўтыя зубы «прадавец» і гыгыкнуў. Відаць, ад таго, што так складна атрымалася.

Сяргей ужо адлічваў грошы.

— Пачакай, пачакай, сынку… — Раман Ігнатавіч трымаў у руках адзін з нязграбных венікаў, паварочваў яго, а потым злёгку трасяніў. З веніка пасыпалася дробнае сухое лісце.

— Не псуй мне тавар!

— Які ж гэта тавар?! — усё больш распаляўся Раман Ігнатавіч. — Восенню вязаў?

— Учора…

— Свежыя, значыць… Рэклама на вышыні, як у тэлевізары.

— Не падабаецца, адыдзіце. Без вас купяць. Спецыялісты знайшліся, нямытыя…

— Ты толькі паглядзі, — бацька ўжо звяртаўся да сына, які стаяў побач крыху збянтэжаны. — Дротам захамутаў, іржавым… Прайдоха!

— Но-но!.. — няголены пазіраў па баках. — Допыт яны робяць… Псуюць-крышаць тавар. Дзе тая міліцыя?..

— Будзе і міліцыя, — Раман Ігнатавіч зрабіў паўзу і таксама азірнуўся. — Спіну ж падзярэш гэтым венікам. Вакол вада, заражэнне пойдзе. Справа сур'ёзная, гангрэнай усё можа скончыцца…

Некалькі чалавек спынілася каля іх, не разумеючы, што здарылася.

Сяргей крануў бацьку за рукаў:

— Тата, часу няма.

— Ты пачакай, — Раман Ігнатавіч працягваў вывучаць позіркам прадаўца венікаў. — Ты дзе працуеш, на якія сродкі жывеш?

— Не твая справа.

— Будзе мая. Не такіх на правільны шлях ставілі.

— Не крадзенае ж прадаю. Прыліплі да мяне… Як той ліст да аднаго месца.

— Ты, відаць, на самай справе дармаед?! — гледзячы ў вочы няголенаму, адсек бацька. — Гэта пра такіх газеты пішуць. Трэба не толькі пісаць, а нешта рабіць.

— Но-но!.. — прадавец венікаў па-ранейшаму не знаходзіў лепшых слоў для апраўдання.

А бацька, згледзеўшы пустыя бутэлькі, брудную паперу ў ірванай сумцы, што стаяла побач з мехам, давяршаў:

— Калі ўсе працуюць, ты бутэлькі збіраеш, транты розныя. А потым брудными рукамі венікі вяжаш — немаведама з чаго. Якімі можна спіну параніць ці іншае што распароць… Разбяромся! Браценік гэтакімі справамі і займаецца. Зараз яму дадзім сігнал. А каб людзей тут не збіраць, не палохаць — зробім гэта лепш у лазні…

Сяргей дзівіўся бацькавай фантазіі і наконт дармаедства, і адказнай работы немаведама якога «браценіка».

— Тата, пайшлі.

Раман Ігнатавіч павярнуўся да сына і неўпрыкмет падміргнуў яму. А потым і выказаўся, ніяк не ціха:

— Хоць аднаго на чыстую ваду выведзем… Як ты думаеш, Сяргей Раманавіч, па нашым сігнале памянялі ў гэтай лазні ваду ў басейне ці не? А то і гэтага дырэктара мяняць прыйдзецца.

Безумоўна, уладар не вельмі якасных венікаў чуў гэтыя словы. І як толькі за Раманам Ігнатавічам і яго сынам зачыніліся дзверы лазні, ён узваліў на плечы вялізны мех з венікамі, у другую руку ўзяў ірваную сумку з пустымі бутэлькамі і паклыпаў за вугал.

— Парадак! — у вачах бацькі свяціліся вясёлыя агеньчыкі.

Але ад акна госць з вёскі не адыходзіў.

— Як я не здагадаўся пакласці табе ў багажнік парачку? Сваіх, якасных.

— Тата! Ну што ты на іх зацыкліўся… Абыдземся сёння без венікаў, — Сяргей ужо трымаў у руцэ два прапускныя білеты ў лазню. — Можа, хто выручыць… Наведвальнікі так робяць.

— Не, сынку. Без свайго веніка ў гэтае завядзенне я не хадок. А ты ідзі. Я тут цябе пачакаю. Заадно пацікую гэтага дармаеда. Павінен жа вярнуцца…

Рыбінск — горад хлебны

Жыццё і творчасць Максіма Багдановіча ў Цэнтральнай Расіі традыцыйна звязваецца з Ніжнім Ноўгарадам і Яраслаўлем. Для гэтага ёсць усе падставы. Вызначэнне іншых локусаў — не толькі пашырэнне сямейнай геаграфіі, але і ўзбагачэнне новымі фактамі гісторыі беларуска-расійскіх культурных кантактаў.

Рыбінск — другі па велічыні горад у Яраслаўскай вобласці. Размешчаны на Волзе, за 80 км ад абласнога цэнтра. У пачатку ХХ ст. гэта купецкі поліс, які разбагацеў за кошт выгаднага геаграфічнага знаходжання, славутай хлебнай біржы.

Віленскае рэха

Буйны, дынамічны гандлёвы цэнтр вабіў прадстаўнікоў розных веравызнанняў. Рыбінск адносіўся да Ціраспальскай епархіі Магілёўскай мітраполіі рымска-каталіцкай царквы. У 1910 г. тут быў узведзены неагатычны касцёл Найсвяцейшага Сэрца Ісуса, адзіны каталіцкі храм у Верхнім Паволжы. Майстры запрошаны з Мінскай губерні.

Грошы паступалі з гістарычнай радзімы мясцовых каталікоў, збіраліся сярод месцічаў. Вялікую ролю ў арганізацыі будаўніцтва, зборы сродкаў адыграў святар Іосіф Бародзіч. Пасля заканчэння Віленскай каталіцкай семінарыі пастырскую службу ён нёс у Лідзе, Троках, Даўгелішках, Гродне, Вільні. Займаўся будаўніцтвам храмаў у Клюшчанах і Міёрах.

Браты Залатаровы (злева направа): Аляксей, Мікалай, Давыд, Сяргей. Рыбінск (?). Пачатак ХХ ст.

Будынак былой Рыбінскай біржы. Сучасны выгляд.

Верш М. Багдановіча «Касцёл св. Анны ў Вільні» напісаны ў 1911—1912 гг., пасля наведання паэтам былой сталіцы Вялікага Княства Літоўскага, знаёмства з архітэктурай горада і ўнікальнай калекцыяй беларускіх артэфактаў, сабранай Іванам Луцкевічам:

Каб залячыць у сэрцы раны,
Забыць пра долі цяжкі глум,
Прыйдзіце да касцёла Анны,
Там знікнуць сцені цяжкіх дум.

Прыкладна ў час узвядзення касцёла ў Рыбінску пачыналася журналісцкая дзейнасць паэта. Падзея была настолькі гучная, што М. Багдановіч проста не мог пра яе не чуць. Варта ўважліва папрацаваць з яраслаўскімі

Касцёл у Рыбінску. 1910-я гг.

(і не толькі) выданнямі, з якімі паэт супрацоўнічаў. У самім Рыбінску друкарская справа, выхад перыёдыкі былі арганізаваны яшчэ ў 1860-х гг. На пачатку ХХ ст. вядучае гарадское выданне — «Вестник Рыбинской биржи» (1902—1917), грамадская, гандлёва-прамысловая і літаратурная газета.

Радзіннае, сяброўскае, творчае

Горад Рыбінск — родавае гняздо Залатаровых і Дзябольскіх, многія з якіх потым перабраліся ў Яраслаўль. Асобныя прадстаўнікі гэтых знакамітых сем'яў уваходзілі ў кола найбліжэйшых сяброў і знаёмых М. Багдановіча, паспрыялі развіццю некаторых тэм, вобразаў і сюжэтаў у творчасці беларускага паэта, садзейнічалі захаванню памяці пра яго. Дзякуючы гэтым сувязям з'явіліся на свет верш-пасланне «Д. Д. Дзябольскаму», вершаванае апавяданне «Вераніка», іншыя творы.

Галава сям'і Залатаровых — Аляксей Аляксеевіч — праваслаўны святар, протаіерэй Спаса-Праабражэнскага сабора ў Рыбінску, меў пяцёра дзяцей: чатырох сыноў і адну дачку.

З Аляксеем Залатаровым (малодшым), пісьменнікам і краязнаўцам, М. Багдановіча звязвалі агульная цікавасць да пытанняў культуры і гісторыка-літаратурнага працэсу. У архіве паэта захоўвалася паштоўка, адрасаваная сябру, у 1923 г. перададзеная ў Мінск разам з іншымі дакументамі і рукапісамі. А. Залатароў напісаў успаміны пра М. Багдановіча, поўны тэкст якіх страчаны разам з усім архівам паэта ў час Вялікай Айчыннай вайны.

Знаёмства з этнографам і антраполагам Давыдам Залатаровым адбылося на кватэры Дзябольскіх у Яраслаўлі. У газеце «Голос» ад 21 чэрвеня 1915 г. быў надрукаваны невялікі аглядны артыкул аўтара «Вянка», прысвечаны пятаму нумару часопіса «Русский экскурсант», у якім сярод іншага была адзначана справаздача Д. Залатарова «Аб першым з'ездзе выкладчыкаў геаграфіі ў Маскве».

Філосаф Дзіядор Дзябольскі нарадзіўся ў Рыбінску ў сям'і міравога суддзі. Дзед па лініі маці — Юліян Смаленскі — быў ганаровым грамадзянінам горада.

У творчай спадчыне М. Багдановіча заўважна вылучаецца вершаванае апавяданне «Вераніка». Эпіграфам да яго паслужылі словы Джавані «Яна — выдумка маёй галавы», якія ў будучыні істотна ўскладнілі даследчыцкія пошукі прататыпа. Дзіядор Дзмітрыевіч адным з першых выказаўся на гэты конт, напісаў пра сваю маленькую пляменніцу Вераніку, з якой Максіма звязвалі вельмі цёплыя стасункі.

Маці Веранікі — Аляксандра Залатарова — сястра Дзіядора Дзябольскага і жонка Давыда Залатарова. Да моманту знаёмства з М. Багдановічам вучылася на Вышэйшых жаночых (Бястужаўскіх) курсах у Пецярбургу. Месцам летняга адпачынку прадстаўнікоў абедзвюх сем'яў была вёска Кісяліха паблізу Рыбінска. Тут асабліва любіла бавіць час маленькая Вераніка.

Ад берагоў Волгі да Нёмана

Жыццёвыя шляхі вялі выхадцаў з Рыбінска не толькі ў цэнтр губерні або сталічныя ўніверсітэты, але і наўпрост прыводзілі ў родныя мясціны будучага класіка беларускай літаратуры. У пачатку ХХ ст. Марыя Залатарова, сястра Давыда і Аляксея, працавала ў Марыінскай жаночай гімназіі г. Гродна, пра што сведчаць архіўныя матэрыялы з фондаў Рыбінскага музея-запаведніка.

Пасля заканчэння Бястужаўскіх курсаў у Пецярбургу (1906) М. Залатарова выкладала ў гімназіях Гродна, Духаўшчыны (Смаленскі край) і Разані. У 1907 г. выйшла замуж за свайго земляка, юрыста Аркадзя Сырамятнікава, рэвалюцыянера, члена бальшавіцкай фракцыі РСДРП з 1904 года. У савецкі час Марыя Сырамятнікава — супрацоўніца Цэнтральнага дзяржаўнага гістарычнага архіва СССР (Масква), а таксама збіральніца і захавальніца дакументальных збораў сям'і Залатаровых.

Біёграфам добра вядома, як уважліва ставіўся М. Багдановіч да любых вестак з роднага краю. У горадзе над Нёманам спачыла яго маці. Не выключана, што М. Залатарова (Сырамятнікава) была своеасаблівым звенчаком памяці паэта пра гады маленства і сямейнага шчасця.

Адам Багдановіч і… «Лявоніха»

Рыбінскае навуковае таварыства, заснаванае яшчэ ў 1909 г., пры савецкай уладзе ўступіла ў новы перыяд сваёй дзейнасці, гвалтоўна згорнутай у 1930-м. У 1920 г. арганізацыю ўзначаліў Аляксей Залатароў, выкладчык прамыслова-эканамічнага інстытута.

У 1920—1929 гг. у Рыбінску праводзіліся краязнаўчыя з'езды, у якіх бралі ўдзел не толькі мясцовыя энтузіясты, але і прадстаўнікі вядучых навуковых і культурна-асветніцкіх устаноў Савецкага Саюза.

Адам Багдановіч запомніўся на гэтых форумах не толькі як аўтар дакладаў «Навуковыя бібліятэкі ў Яраслаўлі» і «Этнічны склад насельніцтва Верхняга Паволжа». У занатоўках Мікалая Анцыферава, спецыяліста па гісторыі Санкт-Пецярбурга, арганізацыі экскурсійнай справы, чытаем наступнае:

«Памятаецца, гэта было ў жніўні 1926 года. У Рыбінску, адным з цэнтраў краязнаўчага руху, адбыўся з'езд яраслаўскіх краязнаўцаў, арганізаваных выдатным энтузіястам-знатаком А. А. Залатаровым. На з'ездзе былі заслуханы цудоўныя даклады, а пасля заканчэння з'езда — сяброўская вечарына.

Марыя Залатарова (справа) і Людміла Томасан. Гродна, 1909 г.

На вячэры гучалі прамовы пра будучыню краязнаўства. Я звярнуў увагу на моцнага, каржакаватага аратара, палкага, але не шматслоўнага. Ён насіў вусы, якія спускаліся да падбародка, але не доўгія, і валасы яго спускаліся на шыю, але не да плячэй. І танцаваў ён хвацка "Лявоніху", народны танец беларусаў. Гэта быў Багдановіч — бацька вядомага беларускага паэта».

У часопісе «Краеведение» (1927, № 1) змешчаны артыкул Аляксея Залатарова «Вынікі сямі Рыбінскіх краязнаўчых з'ездаў». Візуальным суправаджэннем у ім стаў калектыўны здымак удзельнікаў сёмага форуму, на якім даволі лёгка пазнаць прадстаўнічага з выгляду Адама Багдановіча.

Хлебная скарбніца ў пачатку ХХ ст., Рыбінск і ў XXI ст. гатовы падзяліцца назапашаным інтэлектуальным спажыткам з усімі зацікаўленымі гісторыяй, краязнаўствам, творчасцю вечна маладога беларускага паэта.

Мікола ТРУС,
кандыдат філалагічных навук.
Фота з фондаў Рыбінскага музея-запаведніка

Перад намі з памяццю сваёй

На мінулым тыдні адзначыў 90-годдзе вядомы беларускі паэт, драматург, крытык, публіцыст, перакладчык і былы галоўны рэдактар «Літаратуры і мастацтва» Анатоль Вярцінскі. Рэдакцыя штотыднёвіка звярнулася з просьбай расказаць пра юбіляра да яго калегі па «мастацкім цэху» пісьменніка Анатоля Бутэвіча.

Творчая асоба Анатоля Вярцінскага даволі значная і прыкметная ў беларускай літаратуры, ва ўсёй нашай культуры. І гэта не юбілейнае перабольшанне, не традыцыйна звыклая выснова з нагоды. Гэта праўда, якую пісаў і піша Анатоль Ільіч праз усё сваё няпростае, але такое насычанае і багатае на падзеі, жыццё. Праўда мо яшчэ і таму, што самы пачатак яго жыццёвага шляху быў абпалены пякучым полымем самай жорсткай вайны, што давялося на свае вочы ўбачыць і бязмерны чалавечы гераізм, і да болю скрушлівыя праявы нечалавечнасці.

Усё тагачаснае жыццё беларусаў, і не толькі іх, так апякло чуллівую душу (а мо загартавала?), што змусіла праз гады на кожным новым вітку асэнсавання згадваць перажытае, выдыхаць з сэрца тыя праўдзівыя і кранальныя радкі, што змушаюць і радавацца, і плакаць, і ганарыцца, і смуткаваць.

Я перад вамі з памяццю сваёй,
Адному мне бывае цяжка з ёй.
Ідзе яна за мною, след у след,
ідзе за мною многа зім і лет.
Я перад вамі з памяццю сваёй…
Ніколі ўжо я не забуду бой,
дзе ўбачыў блізка
смерць упершыню,
дзе сябра я выносіў з-пад агню…

Падаецца, што тыя абставіны жыцця прадвызначылі далейшы характар і лёс Анатоля Вярцінскага: не баяцца цяжкасцей, смела глядзець у вочы жыццёвай праўдзе і ніколі-ніколі не пакідаць у бядзе сябра. Нездарма галоўным вызначэннем шматаблічнага жыццёвага лёсу Анатоля Вярцінскага з'яўляецца творчасць, паэзія. Яна захапіла яго, а ён пранікся ёй да самага донца сваёй душы. Таму вершы яго, паэмы знаходзілі адразу пасля надрукавання і знаходзяць дагэтуль жывы водгук і поклічны розгалас у душах прыхільнікаў беларускага мастацкага слова.

Дарэчы, сёлета і яшчэ адна памятная для Анатоля Ільіча дата: 70 гадоў таму, у 1951 годзе, быў надрукаваны яго першы верш.

Прызнаюся, што да паэзіі Анатоля Вярцінскага ў мяне запачаткавалася цікавасць яшчэ ў студэнцкія гады, падчас вучобы на філфаку адзінага на той час у Беларусі ўніверсітэта — Беларускага дзяржаўнага імя У. І. Леніна, які, дарэчы, сёлета адзначае свой 100-гадовы юбілей, а мае аднакурснікі — 50-годдзе заканчэння вучобы. «Тры цішыні» Анатоля Вярцінскага, якія ўбачылі свет у 1966 годзе, мелі ў нашым студэнцкім інтэрнаце на Паркавай магістралі такую зацікаўленасць, што вельмі часта не давалі заснуць амаль да раніцы, калі мы горача, з чытаннем вярцінскіх радкоў, даказвалі альбо аспрэчвалі тую ці іншую праяву нашага жыцця.

Анатоль Вярцінскі.

А праз два гады тое ж адбывалася і з новым паэтычным зборнікам Анатоля Вярцінскага з сімвалічнай назвай «Чалавечы знак».

А мы, студэнты, здзіўляліся паэтавай вобразнасці і назіральнасці, захапляліся майстэрствам адчуваць мелодыю паэтычнага слова.

Аднекуль з касмічнай вышыні
зыходзяць да нас тры цішыні.
Першая — вечаровая.
Тая, што, як маг,
ахутвае, зачароўвае —
лёгкі ў мага ўзмах.
Тая, што на вейкі
і вусны кладзе пячаць:
«Хопіць з вас, чалавекі,
Хопіць дбаць! Спаць, спаць!»

Вядома, тадышнім студэнтам, разбуджаным так званай хрушчоўскай адлігай, было прасцей дыскутаваць на падобныя тэмы, бо і нашы выкладчыкі, і самі паэты і празаікі ахвотна далучаліся да новага асэнсавання той рэчаіснасці, што панавала зусім нядаўна. А тут яшчэ і Анатоль Вярцінскі падказваў: «Трубіць ціша світальная // у свой сярэбраны рог, // заве ў далі дальнія, // да новых спраў і дарог».

Але ў мяне асабіста ўжо ў тым нашым студэнцкім сумоўі асаблівую зацікаўленасць выклікала ваенная тэма Анатоля Вярцінскага. Нездарма многія вершы з кніжкі «Тры цішыні» і з іншых я чытаў і перачытваў неаднойчы.

Анатоль Вярцінскі і Максім Танк падчас сустрэчы з чытачамі.

І прызнаюся, што кожны раз знаходзіў новае адценне, новы паварот думкі, новую эмоцыю. Так было і з іншымі паэтычнымі кнігамі Анатоля Вярцінскага. А іх выйшла нямала, згадаю хоць бы некаторыя: «З'яўленне», «Час першых зорак», «Ветрана», «Святло зямное», «Хлопчык глядзіць…», «Жанчына. Мужчына. Каханне…», паэмы «Песня пра хлеб», «Заазер'е», «Дажынкі» і інш. Усё гэта годна клалася на душу яшчэ і таму, што ішло ад жыцця, ад шанавання самага дарагога і звыклага. Паэтавы словы заахвочвалі і нас іншымі вачыма зірнуць на тое, што вакол, што здавалася звыклым і нявартым паэтычнага ўвасаблення. А Анатоль Вярцінскі заахвочваў бачыць усё ў іншым святле, у сваёй першаснай каштоўнасці і непаўторнасці. І тады самыя простыя яго словы нібыта ажывалі, дадавалі энергіі і жадання быць з людзьмі, быць разам, сумесна.

Мо і праз гэта нямала паэтычных радкоў Анатоля Вярцінскага (мне часам здавалася, што яны зусім не музычнага гарту) сталі песнямі. Папулярнымі, не забытымі і сёння. Зноў жа прызнаюся: не магу без хвалявання слухаць пра тое, што «Было ў салдата два полі, // поле, дзе кветкі збіраў, // бегаў з сябрамі на волі, // і поле, дзе ён паміраў». А яшчэ да трымцівасці даводзяць радкі з верша «Рэквіем па кожным чацвёртым»: «Вы бачылі лес, дзе прагал скразны? // Скажыце, вы бачылі бор той, // дзе кожнай другой няма сасны // ці сама меней — чацвёртай?.. // Яны і сёння не зараслі, // свіцяцца прасторай мёртвай… // Вы бачылі лес, дзе прагал скразны? // Скажыце, вы бачылі бор той?»

Паэт не баіцца звяртацца напрамую да чытача, задаваць яму няпростыя пытанні. І спадзяецца, што адказ атрымае. Бо гэтыя пытанні не прамінулыя, а заўсёдныя. На іх часам няпроста адказваць. Але без гэтага ці будзем мы чалавекамі, людзьмі? Пра тое ж вершы-песні «Два полі», «Было імя ў салдата», «Дарога партызанская», «Я перад вамі з памяццю сваёй…», «Плач спаленай вёскі» і іншыя. Шмат што з напісанага Вярцінскім сведчыць: перажытае, пражытае ніколі і не перад чым не варта забываць. Каб не паўтарылася тое нядобрае, што давялося вытрымаць, каб не забылася тое, што сталася гонарам і дастойнасцю народа.

Не, не толькі ваенная тэма прысутнічае ў творчасці Анатоля Вярцінскага. Абсяг яго разваг, меркаванняў, пасылаў такі значны, што кожны зацікаўлены знойдзе для сябе найбольш блізкае і хвалюючае, тое, што робіць жыццё не марнаваннем часу, а становіцца патрэбай аддаваць іншым дадзенае Богам, аддаваць для карысці і жыццёвай праўды. Шмат што з напісанага Анатолем Вярцінскім сведчыць: перажытае, пражытае ніколі і не перад чым не варта забываць. Каб не паўтарылася тое нядобрае, што давялося вытрымаць, каб не забылася тое, што сталася гонарам і годнасцю народа.

Насуперак пэўнай прыземленасці (у добрым сэнсе гэтага слова), а часам мо і знарочыстай публіцыстычнасці ў слове Анатоля Вярцінскага жыве, пульсуе, дабіраецца да сэрца чытачоў сапраўдная філасофская думка. Не адмаўляецца паэт і ад уласцівай яму алегарычнасці. За час жыцця з паэзіяй і ў паэзіі ў Вярцінскага склалася і развілася свая манера пісьма, свой паэтычны стыль, які я назваў бы стылем Вярцінскага.

Анатоль Вярцінскі з Іванам Шамякіным.

Мне падаецца, Анатоль Вярцінскі так глыбока ўсвядоміў і асэнсаваў жыццёвую праўду, што яна сталася сэнсам і яго асабістага жыцця. Яму нельга не верыць, а таму многае хочацца — і варта — перачытваць. Каб не сумаваць, каб не марнаваць жыццё, каб здзейсніць Божае наканаванне: рабі людзям тое, што хочаш, каб яны рабілі табе. Згадаю адзін прыватны, асабісты прыклад. Некалі я надрукаваў водгук на яго кнігу «Чалавечы знак». Пазней Анатоль Ільіч напісаў на ёй: «Дарагі Анатоль Іванавіч, вялікі дзякуй за прыязнасць, за добрыя адносіны, у тым ліку — да гэтай кнігі».

Такі ён ёсць — паэт Анатоль Вярцінскі. Усёй моцай свайго паэтычнага слова ён заклікае любіць жыццё ва ўсёй яго шматграннасці, любіць праўду і справядлівасць. Бо сам безадмоўна і назаўсёды зразумеў, што «Жыццё даецца, каб жыццё тварыць», і далучае да гэтай навукі жыць усё новыя і новыя душы.

Жыццё даецца, каб жыццё тварыць.
Надзеяй, праўдай, мужным парываннем,
высакародным, дружным намаганнем,
што потым зоркай у вяках гарыць.
Тварыць!

Анатоль БУТЭВІЧ

Пазачасавае, філасофскае, канцэптуальнае

Першае ў Беларусі трыенале «Канцэпт» адкрылася ў Рэспубліканскай мастацкай галерэі «Палац мастацтва». Выяўленчае і дэкаратыўна-прыкладное мастацтва, фатаграфія, арт-дызайн, інсталяцыі, відэаарт — прэзентаваны зрэз работ папулярных і не вельмі мастацкіх практык ад майстроў розных пакаленняў з Мінска і ўсіх рэгіёнаў краіны. У экспазіцыі як асобныя работы, так і цэласныя праекты — усяго на фестывалі каля 450 твораў ад 200 аўтараў, якія актыўна працуюць у гэтым кірунку. Да ўдзелу былі запрошаны прафесійныя мастакі, а таксама студэнты і аматары, якія прайшлі папярэдні адбор Беларускага саюза мастакоў — арганізатара I трыенале «Канцэпт».

Дыялог аб мастацтве

Падчас прэс-канферэнцыі, прысвечанай адкрыццю «Канцэпту», першы намеснік старшыні Беларускага саюза мастакоў мастацтвазнаўца Наталля Шаранговіч расказала, што фестываль сталі рыхтаваць яшчэ ў пачатку года і атрымалі вынік: колькасць заявак, пададзеных на ўдзел, была вялікая. Стваральнікі маштабнай экспазіцыі імкнуліся паказаць, што ў Беларусі ёсць шмат аўтараў, якія гавораць на нетрадыцыйнай мове з вялікай колькасцю эксперыментаў і нечаканай пластыкай.

— Саюзу мастакоў важна было выступіць каталізатарам працэсу. Наша роля заключалася ў тым, што мы прапаноўваем ідэю і знаходзім сабе партнёраў, — расказала Наталля Шаранговіч. — Хацелася сфарміраваць пэўнае творчае поле, каб у яго ўключыліся мастакі розных пакаленняў. Моладзь, якая толькі пачынае ўдзельнічаць у нашых праектах, атрымлівае дадатковы стымул. Можна ўбачыць, з чаго ўсё пачалося і да чаго прыйшло. Калі мы гаворым аб канцэптуальным мастацтве, то разумеем, што ў Беларусі ў чыстым выглядзе яно адсутнічае. У нас жа няма такой традыцыі або школы. Тым не менш ёсць шмат мастакоў, якія хочуць эксперыментаваць з тэхнікай, пластыкай, тэмай. А гэта ўжо выхад у іншую прастору, паралельную рэальнасць у мастацтве, што цікава гледачам і самім мастакам.

Валерый Песін «Птушаняты ў паветры», 2021 г.

Намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення — начальнік упраўлення прафесійнага мастацтва Міністэрства культуры Марыя Нецвятаева адзначыла, што ў сучасным мастацтве вялікая роля адведзена куратару. У дадзеным выпадку гэтую работу ўзяў на сябе Беларускі саюз мастакоў.

— Гэта вялікая праца, якая не застанецца незаўважанай гледачом. Яму будзе здавацца, што ўсё арганічна ў прасторы, дзе экспануюцца творы. Аднак зразумець, якая за ўсім стаіць работа, дастаткова цяжка, калі ты з гэтым ніколі не сутыкаўся. Важна, што такія маштабныя праекты ў першую чаргу заклікаюць да дыялогу. Цяпер трыенале — праект, які выводзіць на дыялог аб сучасным беларускім мастацтве, — адзначыла Марыя Нецвятаева.

Гняздоўе эксперыментаў

Кожная з работ на трыенале прадстаўляе асобныя канцэпты, у якіх ёсць эксперыменты з формай, пластыкай, колерам, святлом… Гледачы павінны быць гатовы да метамарфоз, трансфармацый, актуалізацый і ператварэнняў. Як заўсёды, вылучаюцца творы вядомага мастака Валерыя Калтыгіна. Яго своеасаблівая серыя — «Буржуйка-1» (2008), «Буржуйка-2» (2009), «Буржуйка» (2019) — гульня з паветрам, адлюстраванне крохкасці прыгожага, адметнае бачанне фігуратыўнай скульптуры. Некалькі арт-аб'ектаў, унікальных, створаных з таго, што ў літаральным сэнсе магло быць сабрана на вуліцы (дрот, трубы, жалезабетонныя слупы), прадставіў Алесь Фалей. Мноства дасціпных твораў прэзентаваў Сяргей Шыла, якому падуладныя і дрэва, і метал, і палатно. Выкарыстоўвае ён і пластык: што іранічна, у творы «Гняздоўе» прадстаўлены зямны шар — некалі частка арт-аб'екта была глобусам. Але што такое пластык у параўнанні з косткамі жывёл, якія ў сваіх работах выкарыстоўвае Антон Мартынюк?

Васіль Васільеў «У чаканні Маісея», 2021 г.

Не засталіся па-за ўвагай гледача, прынамсі, на адкрыцці цэнтральнай экспазіцыі, работы, у якіх істотна важная кожная дэталь: «Гісторыя як міфатворчасць» (2021) Рональда Кісялёва, «Інцыдэнт у начной маршрутцы» (2020) Сяргея Грыневіча, «Характарыстыка» (2021) і серыя «Азбука мадэрнізму» (1996) Сяргея Кажамякіна…

Між тым на трыенале «Канцэпт» заўважна, што мастакі не баяцца адвесці позірк ад надзённага ці агульнаграмадскага, не саромеюцца разважаць пра ўнутранае «Я», пра такое пафаснае для кагосьці вечнае. Найлепшы прыклад — адметная скульптура Андрэя Вераб'ёва «Нараджэнне, жыццё, смерць і жыццё пасля смерці Андрэя Вераб'ёва» (2021).

У Палацы мастацтва хапае і цэласных праектаў асобных аўтараў. Напрыклад, «*Luminarium*» гродзенскага мастака Аляксандра Балдакова прадстаўляе серыю арт-аб'ектаў, графічных кампазіцый і прасторавых структур, аб'яднаных аптычнымі якасцямі святла і яго мастацкай трансфармацыяй. «Залежнасць» віцебскай мастачкі Валянціны Ляховіч, рэалізаваная Віцебскім цэнтрам сучаснага мастацтва, прэзентуе жывапіс і канцэптуальныя аб'екты ў стылістыцы трэш-арт. Уласны павільён атрымала мінская аўтарская некамерцыйная галерэя «Брама»: тут змешчаны чорны метал Марыі Тарлецкай, а таксама работы са шкла Алены Чэпелевай і Жанны Марозавай. Брэсцкі мастак Уладзіслаў Куфко прадставіў праект-атракцыён «Вялікі Круіз», своеасаблівую метафару стварэння свету і падарожжа душы па сусвеце. Адметны праект — «Дэканструкцыя» Дзмітрыя Аганава. «Спалены матыў» (2021), «*Dreaming*» (2021), «Аўтапартрэт» (2018), «Дуалізм» (2021) ды іншыя не такія кідкія па некаторых характарыстыках у параўнанні з многімі на трыенале, аднак іх чароўнасць — для ўдумлівага гледача.

Антон Мартынюк. З праекта «Альтэрнатыва».

Прыступка новых форм і сэнсаў

У экспазіцыі «*Designatum*», што адкрылася ў Мастацкай галерэі Міхаіла Савіцкага ў рамках трыенале «Канцэпт», — скульптура і графіка, якія аб'ядноўваюць пошук спосабаў новага мастацкага выказвання праз арыгінальную форму.

— У нас атрымалася не ў чыстым выглядзе канцэптуальная выстаўка, — падкрэсліў падчас адкрыцця намеснік старшыні Беларускага саюза мастакоў Андрэй Басалыга. — Тут можна ўбачыць шмат работ традыцыйнага мастацтва. Нельга адразу пераскочыць усе стадыі развіцця і апынуцца на тым узроўні сучаснага канцэптуальнага мастацтва, якім дыхае планета. Мы крыху спазняемся ў гэтым кірунку. Тым не менш не стаім на месцы, развіваемся і ўключаны ва ўсе працэсы. У праекце «*Designatum*» мы сабралі самыя паказальныя імёны мастакоў, якія працуюць з новымі формамі і сэнсамі.

У галерэі Міхаіла Савіцкага работы прадставілі 8 творцаў: графік Андрэй Басалыга і скульптары Максім Пятруль, Аляксандр Шапо, Дзяніс Кандрацьеў, Аляксандр Сакалоў, Кірыл Крахалёў, Павел Куніцкі, Марына Баранчык-Красоўская. Тэксты-анатацыі да скульптур і графічных твораў былі напісаны самімі аўтарамі. Гэта радуе: усё ж стварэнне тэксту — творчы працэс, які непарыўна звязаны з самім творам. З яго дапамогай можна ці адчуць пункт адліку, ці адшукаць ключ да разумення, ці знайсці пэўныя падказкі.


Васіль Касцючэнка «Скрыжаванне», 2021 г.

Як лічыць куратар выстаўкі Іван Арцімовіч, сёння беларускае мастацтва знаходзіцца ва ўнікальным становішчы: захоўвае ў сабе традыцыю і ў той жа час арганічна ўбірае і прымае новыя формы канцэптуальнага мастацтва.

— Для мяне было важна працаваць з мастакамі, якія выкарыстоўваюць сучасную пластычную мову, якія не саромеюцца творчых эксперыментаў і напаўняюць работы не толькі знешнім, але і глыбокім унутраным зместам. І гэта ў кожнага сваё — пазачасавага, філасофскага, агульначалавечага парадку, — разважае Іван Арцімовіч.

Экспазіцыю «*Designatum*» можна наведаць да 12 снежня.

Планаваць і не спяшацца

Асобныя выстаўкі праекта адкрыюцца і на іншых пляцоўках сталіцы ў фармаце фестывалю мастацтва. Так, акрамя «*Designatum*», ужо прэзентавана экспазіцыя «*Movement*» — у Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі прадставілі жывапіс з калекцыі БСМ і работы выставачнага праекта I трыенале «Канцэпт». Гарадская мастацкая галерэя твораў Л. Д. Шчамялёва з 1 снежня запрашае на выстаўку мастака-авангардыста «Аляксандр Салаўёў. Як ёсць…» (заслужаны дзеяч мастацтваў БССР пайшоў з жыцця ў маі 2021 года). 8 снежня ў арт-гасцёўні «Высокае мѣста» прадставяць эксперыментальны тэкстыль «*Tex-experience*».

Алеся Скарабагатая «Гасцінчык I», 2021 г.

Між тым цэнтральная экспазіцыя ў Палацы мастацтва будзе працаваць да 16 снежня. Раім планаваць наведванне — часу на вандроўку па залах Палаца мастацтва, не кажучы ўжо пра абдумванне большасці твораў, спатрэбіцца вельмі шмат. Без перабольшання гэта адзін з найбуйнейшых мастацкіх праектаў апошняга часу, аднак ці здольна публіка не заблытацца ў такой колькасці канцэптаў і ацаніць яго маштаб, асэнсаваць зробленае маладымі і сталымі айчыннымі творцамі, вылучыць для сябе найбольш важнае і неабходнае?

Яўгенія ШЫЦЬКА,
фота аўтара

Люстэрка беларускай культуры

Нацыянальны акадэмічны драматычны тэатр імя Якуба Коласа 21 лістапада адзначыў юбілей — 95-годдзе з дня заснавання. У гэты дзень яго наведалі шматлікія госці: міністр культуры Рэспублікі Беларусь Анатоль Маркевіч, прадстаўнікі мясцовых улад, Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Янкі Купалы і Рэспубліканскага тэатра беларускай драматургіі, Дзяржаўнага літаратурна-мемарыяльнага музея Якуба Коласа. Усе яны выступілі ў віншавальнай частцы юбілейнага вечара. Але перад гэтым гасцям і шматлікім гледачам была прадстаўлена прэм'ера спектакля «Ціль» паводле вядомай п'есы Рыгора Горына, якую на коласаўскай сцэне паставіў мастацкі кіраўнік тэатра Міхась Краснабаеў.

У святочныя для тэатра дні мы звярнуліся да вядучых артыстаў і мастацкага кіраўніка з пытаннямі: 1) Якую ролю коласаўскі тэатр адыграў у вашым жыцці? 2) Ці існуе сувязь, пераемнасць паміж рознымі пакаленнямі коласаўцаў? Ці ёсць у тэатра пэўныя традыцыі, якія ён захоўвае? 3) Якой бачыцца будучыня тэатра?

Міхась КРАСНАБАЕЎ, мастацкі кіраўнік (у тэатры з 1985 года):

1. Коласаўскі тэатр — гэта маё жыццё. Сюды я трапіў адразу пасля заканчэння Беларускага тэатральна-мастацкага інстытута, і ўжо служу тут трыццаць сёмы год. Спачатку быў акцёрам, пасля рэжысёрам і нарэшце стаў мастацкім кіраўніком.

2. Напэўна, пераемнасць паміж рознымі пакаленнямі ёсць. Сталыя артысты дапамагаюць маладым, даюць ім пэўныя парады.

3. Веру, што тэатр не знікне, ён запатрабаваны. Часы ліхія перамелюцца, і ўсё будзе добра. І застануцца гледачы, якім цікава творчасць коласаўцаў. А мы будзем адпавядаць патрабаванням аўдыторыі.

Святлана АКРУЖНАЯ, народная артыстка Беларусі, лаўрэат прэміі «За духоўнае адраджэнне» (у тэатры з 1969 года):

1. Гэта велізарны пласт майго жыцця. Напрыканцы вучобы ў Беларускім тэатральна-мастацкім інстытуце на курсе Дзмітрыя Арлова мяне запрашалі розныя тэатры, у тым ліку і маскоўскі — Генадзь Юдзеніч клікаў да сябе. Але тут прыехалі з Віцебска дырэктар Геральд Асвяцінскі і галоўны рэжысёр Сямён Казіміроўскі. Яны разам з Барысам Эрыным, які ставіў «Уладу цемры» Льва Талстога і шукаў выканаўцу на ролю Анюткі, угаварылі мяне выбраць коласаўскі. Пераконваў і Дзмітрый Аляксеевіч, які на той час ужо быў хворы і хацеў аддаць мяне ў добрыя рукі.

У той перыяд трупа коласаўцаў была вельмі моцная. Першыя мае крокі на сцэне былі дастаткова нясмелыя, падтрымалі партнёры: Анатоль Трус, Анатоль Шэлег, Фёдар Шмакаў, Галіна Маркіна. Калі спектакль паказалі ў Маскве, мяне назвалі адкрыццём гастроляў, а маю работу — найлепшым выкананнем гэтай ролі за ўсю гісторыю тэатра. Клікалі ў тры маскоўскія тэатры, але я адмовілася, бо была вельмі занятая ў рэпертуары, і гэта былі ролі, якія мне падыходзілі. Тады ж з'явілася Дачка ў «Зацюканым апостале», вобраз якой вельмі ўхваліў і сам аўтар. Мае намаганні ацанілі: я стала самай маладой заслужанай артысткай БССР — у 29 гадоў. Працавала з многімі выдатнымі рэжысёрамі, якім буду ўдзячная да канца сваіх дзён. Гэта і Казіміроўскі, і Эрын, і Пінігін, і Смелякоў. Аднак былі моманты, калі хацелася пайсці з тэатра — з-за частай змены галоўных рэжысёраў.

Ужо пазней з'явіўся спектакль «Хам» у пастаноўцы Эрына, дзе я іграла Франку. Гэта быў мой зорны час. Некаторыя гледачы сталага веку і зараз прыгадваюць мяне разам з Куляшовым у той пастаноўцы. На жаль, яе не паспелі запісаць на плёнку, бо ў мяне тады здарылася трагедыя з сынам. І «Хам» застаўся, як і многія іншыя спектаклі з маім удзелам, толькі ў памяці тых, хто яго бачыў на сцэне.

2. Традыцыі тэатра былі закладзены яшчэ ў 1926 годзе яго заснавальнікамі, выпускнікамі Беларускай драматычнай студыі ў Маскве. Гэта была выдатная школа, якая склалася пад уплывам вялікіх майстроў МХАТа другога. Іграць з тымі артыстамі было вялікім задавальненнем. Адчувалася яднанне з партнёрамі і публікай. На сцэне я змагла выказацца больш моцна, яскрава, шчыра, чым у жыцці. Потым адбывалася змена пакаленняў, і многія выдатныя майстры сышлі, але парасткі засталіся. Зараз у нас калектыў, які мае неблагі рэпертуар і працуе на глебе псіхалагічнага тэатра.

3. Коласаўскі тэатр быў, ёсць і будзе, бо гэта адлюстраванне беларускай культуры. Пакуль жыве культура, жыве і тэатр.

Таццяна ЛІХАЧОВА, заслужаная артыстка Рэспублікі Беларусь (у тэатры з 1972 года):

1. Я яшчэ да інстытута працавала ў гэтым тэатры, а пасля заканчэння вярнулася. Коласаўскі для мяне адзіны, ніколі яму не здраджвала. Па нейкай жыццёвай мудрасці сям'я звычайна на першым месцы, а праца — на другім. А ў мяне наадварот. Ды і сям'я ж тэатральная: мой муж Генадзь Шкуратаў таксама быў артыстам.

Тэатр не толькі будынак, які таксама ўражвае, галоўнае — напаўненне. І яно з першых дзён мяне ўразіла, найперш — духам тых артыстаў, якія даўным-даўно адышлі. Але засталася творчая, магічная аўра. Я заспела Звездачотава, Труса, Сяргейчыка і пазнейшую плеяду —

Шмакава, Канапельку, Дубава, Шашкіну, Маркіну. Моладзі не так і многа было ў той час. Усе з намі сябравалі. Творчая атмасфера адчувалася і ў фае, і на лесвіцах, і на сцэне, пераносілася ў глядзельную залу. Нават размовы былі творчыя.

Сёння ўсё мяняецца не ў лепшы бок. Нашым душам неабходна падпітка — героямі, якія зніклі і з жыцця, і са сцэны. Час стаў чорна-белы, і гэта адбіваецца на людзях. Я паўжыцця стварала, і раптам прыйшло адчуванне, што хаджу як на працу, быццам тэатр перастаў існаваць. У некаторых з'явілася абыякавасць. Не магу сказаць за ўсю моладзь, але ёсць і такія, хто не разумее, куды яны прыйшлі, як трэба развівацца, каб, прынамсі, праз некалькі гадоў цябе паважалі, любілі тваю творчасць. Прыходзяць, сыходзяць, прычым многія без шкадавання.

2. Пераемнасці, на жаль, няма. Раней у тэатр прыходзіла група моладзі, іх хапалі старэйшыя майстры, і яны многае пераймалі. Гэта не залежала ад таго, любіш ты кагосьці ці не: мы паважалі акцёраў за майстэрства, прафесіяналізм, ганаровыя званні. Мне здаецца, усё спынілася, калі пайшлі завочнікі. Такія кантакты засталіся хіба што на міжасобасным узроўні. Не хачу сказаць, што ўсё зусім дрэнна. Сталыя акцёры часта знаходзяцца ў адных грымёрках з маладымі, якія штосьці ў іх пераймаюць.

3. Хочацца, каб тэатр існаваў, бо гэта адбітак культуры народа, яго найлепшых духоўных якасцей. Чым бы нас ні выпрабоўвалі, тэатр будзе жыць.

Вячаслаў ГРУШОЎ, заслужаны артыст Рэспублікі Беларусь (у тэатры з 1971 года):

1. Тэатр імя Якуба Коласа вызначыў маё жыццё: і творчае, і сямейнае. Ён дапамог разабрацца ў сабе, вырашыць, хто я такі і што з сябе ўяўляю.

2. Натуральна, была сувязь паміж першым пакаленнем коласаўцаў і іх наступнікамі. Цяпер няма такога ланцужка, які б злучаў усе пакаленні паміж сабой. Усё, што змаглі зрабіць пачынальнікі, — пабудаваць гэты тэатр, закласці яго асновы, другое і трэцяе пакаленні — захаваць іх, а чацвёртае і пятае — прымножыць і, што самае галоўнае, не страціць тэатр. Будучыня ж залежыць ад новых людзей, якія прыйдуць працаваць у коласаўскі. Вельмі добра, калі традыцыі змяняюцца, эвалюцыяніруюць.

3. Гэта, як ні дзіўна, вельмі лёгкае пытанне пры ўсёй уяўнай складанасці. Калі ў тэатры захаваецца душа (тут маецца на ўвазе і душа, і духоўнасць, усе складнікі), тады будзе існаваць і сам тэатр. Як казаў Станіслаўскі, галоўнае — гэта жыццё чалавечага духу. А ўсё астатняе — светлавыя, музычныя, камп'ютарныя тэхналогіі — дадатак. Больш за тое, тэатр павінен мець тры ўласцівасці — дзяціннасць, наіўнасць і шчырасць.

Юрась ЦВІРКА, вядучы майстар сцэны (у тэатры з 1991 года):

1. Я апынуўся ў Віцебску дзеля тэатра і дзякуючы яму тут жыву: пабраўся шлюбам, маю сям'ю, пабудаваў кватэру. Калі давялося крыху папрацаваць у Мінску, зразумеў, што віцебскі тэатр — гэта маё, цягнула на родную сцэну. А магло б скласціся па-рознаму. Дзякуй Богу, рэжысёры мяне выбіраюць, і ролі ёсць, і ў горадзе мяне ведаюць. Тэатр для мяне — усё. І гэта не пафасныя словы.

2. На прыкладзе спектакля «Несцерка» відаць, як захоўваюцца традыцыі, бо вобразы пераходзяць з пакалення ў пакаленне. Напрыклад, у гэтым сезоне я ўпершыню сыграў ролю пана Бараноўскага. Раней выканаўцамі былі Сцяпан Скальскі, Барыс Левін, Уладзімір Куляшоў і іншыя. Я люблю пагаварыць з моладдзю, якая, так склалася, не ведае пра гэтую пераемнасць. Яны іншыя, не так паглыбляюцца ў мінулае. Імкнуся ім давесці, што трэба ведаць гісторыю і беларускую мову. У нас былі выпадкі, калі акцёр забываў тэкст, а думку помніў — адразу пераходзіў на рускую. Між тым хацелася б, каб праходзілі бенефісы нашых вядомых акцёраў. Забыліся мы крыху і пра вечары памяці. Гэтыя традыцыі трэба захоўваць.

3. Коласаўскі тэатр будзе, таму што Віцебск — культурны цэнтр, можна сказаць, культурная сталіца Беларусі. Ён мне вельмі па душы. Ёсць у ім нейкая цеплыня, аўра. Як і ў самім тэатры. Хацелася б, каб заставалася моладзь, пражывала тут, як мы, усё сваё жыццё, каб людзі хадзілі паглядзець на акцёраў. Чытаў у буклетах, у газетах, што тэатр наш акцёрскі. На іх ён і трымаецца.

Падрыхтаваў Юрый ІВАНОЎСКІ, літаратурны рэдактар Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Якуба Коласа, тэатразнаўца

Фота з архіва тэатра

Вячаслаў СТАТКЕВІЧ:

«Глыбіня народнай музыкі бязмежная»

Галасістая, залівістая, гуллівая, шматколерная, крылатая і заўсёды жывая народная песня... А ў выкананні заслужанага калектыву Рэспублікі Беларусь Беларускага дзяржаўнага ансамбля народнай музыкі «Свята» гэта палёт эмоцый і наталенне шчырасцю. Нядаўна ансамбль «Свята» адзначыў 37-годдзе, а яго знакаміты кіраўнік Вячаслаў Статкевіч — 50-гадовы юбілей. Як гэта — паяднаць лёс з народнай музыкай і зрабіць яе «Святам» — у нашай гутарцы.

— Вячаслаў, вы аддалі душу народнай песні, а любімаму калектыву прысвяцілі 30 гадоў...

— Крыху меней — 28, у ансамблі «Свята» я з 1993-га, а 30-годдзе адзначаю сваёй агульнай творчай дзейнасці. Цікавасць да беларускай народнай песні ў мяне з дзяцінства. Хораша спявала маці, гэта я ўвабраў, як кажуць, з малаком. Затым многа займаўся сам. Так падабаліся народныя песні, што шукаў варыянты, змяняў рытмічныя малюнкі. Вёў рубрыкі ў часопісах «Гаспадыня», «Роднае слова», друкаваўся ў газеце «Звязда». Першыя песні з дзяцінства, якія запомніліся, — любімыя матуліны «Туман ярам», «Цячэ вада ў ярок». Што ж да апошняй, дык пад яе музыку, памятаю, як танцавалі на вечарынках у клубе вёскі Тарнова, што на Лідчыне, і ў школе. Сам я з вёскі Рэпнікі хутара Паспешка. У нас з'явілася лямпачка Ільіча, толькі калі я вучыўся ў дзясятым класе. На вёску хадзілі тэлевізар паглядзець, асабліва чакалі, калі ў праграме будзе зямлячка — заслужаная артыстка Рэспублікі Беларусь Ганна Радзько. Пастаянна слухаў радыё на батарэйках, у той час гучала шмат розных мелодый. Наша вёска была спеўная, гэта цяпер 13 чалавек толькі засталося. Суседкі ведалі адмысловыя песенныя варыянты. У кожнай народнай песні ёсць аўтар: хтосьці прыдумаў, другі дапрацаваў, трэці падхапіў. Бывае, запісваеш, як бабулька спявае, дык яна спахапляецца: «Ой, тут ужо наспявала з іншай песні!» Часам творы розныя, а куплеты перамяжоўваюцца. Такая трансфармацыя, якая падтрымліваецца народам, ідзе ўвесь час.

— У гэтым няспынная творчасць?

— Так. Адну і тую ж песню можна заспяваць сумна, а можна — весела, яшчэ — дадаць тэмпу, рытму, і яна будзе зусім іншая. Неяк у народнага артыста Беларусі Якава Навуменкі ўзялі ў рэпертуар песню «Ночка, ночка чараўніца». Паскорылі тэмп. Дык ён здзівіўся: «Што вы мне тут за танцы зрабілі?!» Маўляў, ноч — гэта ж цішыня, павольнасць. Таксама як і з песняй «Цячэ вада ў ярок». Рэкі ж нашы цякуць павольна, а зараз песню зрабілі хуткай, амаль полечнай. Такім чынам, мяняецца час, а разам з ім — і ўспрыманне песні. Дарэчы, Якаў Навуменка сваю музычную дзейнасць распачынаў у ансамблі «Свята» тэнарам.

На ніве народнай творчасці мы ў свой час цесна супрацоўнічалі з Ігарам Лучанком, Іванам Раманчуком, Міхаілам Гецам, зараз з Алегам Чыркуном, Дзмітрыем Сушко, Уладзімірам Гінько, Галінай Сёмінай, Леанідам Нікольскім. Дзякуючы паэту Івану Цітаўцу песень маем на тры альбомы. Ён нам як хросны бацька. Назву юбілейнага канцэрта «Я сэрца аддам Беларусі!» я выношваў пяць гадоў і папрасіў, каб ён напісаў тэкст, потым сам яшчэ дапрацаваў, дадаў адзін куплет, а Яўген Дзеравянка паклаў на музыку. Гэта прэм'ера юбілейнай праграмы. Я і сам пішу. У мяне выйшла пяць альбомаў, дзе ёсць і народныя песні, і песні сучасных беларускіх кампазітараў на словы нашых паэтаў. Напрыклад, Валянціны Паліканінай, Івана Карэнды, Міхася Пазнякова, Міколы Чарняўскага, Уладзіміра Мазго, Кастуся Цыбульскага. З Кастусём вельмі даспадобы працаваць, бо ёсць песні, для якіх ён піша і музыку, і словы. На маім юбілейным канцэрце (дарэчы, пакажуць 4 снежня ў 16:35 па БТ3) прагучала чатыры яго творы, два прэм'ерныя. Ёсць песня на словы Алеся Бадака. Але аснова ўсё ж — беларуская народная песня.

— Ваш калектыў першы ў Беларусі пачаў адраджаць народную музычную спадчыну.

— У 1984 годзе, калі стварыўся калектыў, Генадзь Цітовіч сказаў: «Я многа бульбы паспытаў, але ж такой — не». Заснавальнікам ансамбля і першым мастацкім кіраўніком быў заслужаны артыст Рэспублікі Беларусь Васіль Купрыяненка, якога ў гэтым годзе, на жаль, не стала. Ён пасля сябе пакінуў столькі аранжыровак, зборнікаў — дзесяцігоддзі можна купацца ў народнай музыцы. Рэпертуар мы чэрпалі з Палесся. Напачатку было многа песень а капэла, своеасаблівая фішка ансамбля. Палессе — самая многагалосая, самая захаваная мясцовасць, культура. За балотамі — таямніца творчасці. Палешукі на вялікі свет маглі глянуць толькі зімой, калі ляжа лёд, а так сядзелі на купіне. Вось і спявалі. Аўтэнтычная музыка не перастае цікавіць: працуюць маладзёжныя клубы, дзе вывучаюць старадаўнія танцы, спяваюць народныя песні. Шмат моладзі і ў нашым ансамблі. Рознабаковы, цікавы артыст Дзмітрый Барсукоў: можа заспяваць і сыграць на розных інструментах (флейта, дудка, дуда). Антону Пракапцову ўсяго 21 год, але і ён спявае, а таксама іграе на клавішах.

Вячаслаў Статкевіч (у цэнтры) з ансамблем «Свята».

Вольга Казякоўская танцуе, а калі трэба, дык і бразготку возьме, і куплет падпяе. Кожны можа падхапіць на розным узроўні. Артыст Іван Наскоў, які прыйшоў нядаўна, хіліўся больш да эстрады, але пранікся народнай песняй. У нас працуюць людзі розных пакаленняў, хтосьці з вёскі, хтосьці з горада. Але паразумецца дае народная музыка.

— Яна аб'ядноўвае?

— Безумоўна. Бывае цяжка раскруціць эстрадную песню: колькі трэба ўкласці сродкаў! Народную ж спяваеш — яе тут жа падхопліваюць, бо няйнакш дзесьці чулі. Яна адразу западае ў сэрца, запамінаецца. Дарэчы, мы з вамі размаўляем у зале, дзе 18 гадоў таму назад працаваў вялікі Уладзімір Мулявін. Тут стаяў яго раяль. Шпалеры пафарбавалі ўсяго адзін раз, захавалі, што было. Дык вось Уладзімір Мулявін узвысіў народную песню, а Васіль Купрыяненка на такі ж узровень узвёў народную музыку. У яго ўсё было адмыслова напісана, перацякала адно ў другое… Вальсы, кадрылі, лірычныя замалёўкі. Ён сабраў 40 полек. А яшчэ — галопы, траістыя, таўкачыкі, дзятлы... Дзятлы ў свой час у нас танцаваў мастацкі кіраўнік заслужаны артыст Рэспублікі Беларусь Анатоль Кашталапаў. На жаль, ужо тры гады, як яго не стала. У нас багатая рэпертуарная палітра. Музыка, песня, танец — пастаянны сінтэз. А ўвогуле ансамбль «Свята» вельмі мабільны. Бо мы можам усё. Самавіты танцор Віталь Смусянок загадвае нашай балетнай часткай. Людміла Кірыленка, чый муж працуе ў «Бяседзе», — салістка з голасам ад Бога. Выдатная Алена Літаш 25 гадоў у ансамблі як цымбалістка. Язменная, чароўная скрыпачка Таццяна Карабкова з намі з 1996 года. Вельмі таленавітыя бас-гітарыст Ігар Асідчанка і баяніст Антон Малеёнак. Не здраджвае калектыву наш зорны альт Кацярына Булатоўская. Зараз да нас вяртаецца Святлана Байдак. Цудоўнае сапрана ў Вікторыі Катляровай. Па сутнасці, можам абыходзіцца без апаратуры. Гучаць галасы — і ўжо дзея. Хаця вось купілі барабанную ўстаноўку, чакаем барабаншчыка, бо вялікая сцэна патрабуе малюнка. Раней была басэтля. Калі ляталі ў Лондан, Пекін — прыйшлося браць бас-гітару: менш займае месца ў самалёце. А ўвогуле, куды б ні ездзілі, прымалі нас добра. Любая народная культура заўсёды ўспрымаецца выдатна. Нядзіўна, у нас жа мова пасля італьянскай па мілагучнасці другая. Нават перакладчык не патрэбен, бо міні-спектакль на сцэне апавядае найлепш.

— Акрамя агульнавядомай «Цячэ вада ў ярок», у вашым рэпертуары яшчэ безліч адметных песень, сярод якіх — «Куры-чабатуры». Чула яе ва Украіне, праўда, як «Куры-цокотуры». Думаецца, якраз там яе арыгінал... А адкуль наш варыянт?

— Гэтую песню перапрацаваў кампазітар Алег Чыркун, напісаў сваю мелодыю. Яна загучала зусім іначай. Матыў пра шыбку, якую пабілі, напрыклад, найбольш набліжаны да арыгінала. Адкуль песня? Калі браць рэгіён Палесся, складана вызначыць: гэта Піншчына або тая ж Ровеншчына… Калі браць Чарнігаўшчыну (раней Чарнігаўская губерня), там дагэтуль столькі беларускіх песень, што можна выдаваць зборнікі. Калі параўноўваю наш хор і чарнігаўскі, столькі супадзенняў. Заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі Мікола Сірата, які з Чарнігаўшчыны, многае да нас адтуль прывёз. А тая ж Смаленшчына ці Пскоўшчына — столькі цікавых беларускіх песень! Ці паехалі мы ў Новасібірск, а там — беларускія гурты, спяваюць на чысцюткай мове. А прыехаўшы ў Перм, знайшоў радню, якая пераехала туды пасля вайны. Разгаварыліся, згадалі вёску Чаплічы Лідскага раёна. Пачалі разбірацца — мы траюрадныя.

— Так, дзякуючы народнай песні пашыраюцца гарызонты і гістарычныя, і фальклорныя, і тэксталагічныя…

— Адметную песню «Два дубкі» я прывёз з Піншчыны, калі там праходзіў адзін з першых фальклорных фестываляў, якія ладзіў фалькларыст Васіль Ліцвінка. Гэта было ў 1995 годзе, ён адбываўся на баржы, што стаяла на Піне. А ў 1996-м мы ездзілі на першыя «Дажынкі» на Століншчыну. Потым з'явіўся зборнік з малюнкамі Міхася Раманюка пра строі, касцюмы розных рэгіёнаў Беларусі, і менавіта там былі гэтыя «Дубкі» з нотамі і яшчэ два дзясяткі песень. А варыянтаў вельмі багата, у тым ліку тэкставых. У адной з нашых песень «Ой, у полю крыніца» таксама ёсць куплет пра дубкі, якія схіліліся. Потым я прывёз песню «Ох, доля мая, сіні вочы твае, як цябе не бачу, баліць сэрца мае», адрэдагаваў тэкст, дадаў дзве сінкопы, і варыянт падхапілі розныя калектывы: ад Мазыра да Віцебшчыны. Я тады словы «паглядае, пазірае» замяніў на «прыпякае». А ў песні «Ночка цёмная, ноч нявідная, галоўка мая нявыспаная» фразу «не з кім ночку спаць» я змяніў на «з кім жа». Гляджу — адзін калектыў, другі, трэці так зрабілі — расхопліваюць!

— Чаму фальклор не губляе актуальнасці?

— Таму што глыбіня народнай музыкі бязмежная. Хаця зараз народу больш гарадскога, аднак аматары, улюбёныя ў народную песню, былі і будуць. Бо яна простая, запамінальная, з цікавым сюжэтам. Думаеш: як можна было знайсці такія ўдалыя рыфму, вобраз, дзе ў той маленькай сялянскай хатцы кветка можа быць у розных іпастасях: гэта і дзяўчына, і прадмет варажбы, і сушаная заварка для гарбаты. І адсюль столькі ж сюжэтаў. Адметнае і гучанне. На Гарадзеншчыне, напрыклад, менш падгалоскаў. Зусім іншая сітуацыя на Палессі: вядзе першы голас. Што да музычных інструментаў, то цымбалы ў нас лічаць галоўным інструментам, але ж найперш — гэта дуда, дудка. Зазірніце ў тэлефонны даведнік — колькі там прозвішчаў, дзе ёсць корань "дуд, дут". У нашым рэпертуары выкарыстоўваем дудкі, жалейкі, саломкі, ёсць колавая ліра з 1984 года. А вось акардэон характэрны больш для заходняй Беларусі, у нас жа — баян.

— Ці не згас ваш творчы запал падчас пандэміі?

— З дырэктарам «Свята» Маратам Лагуткам мы прынялі рашэнне, што павінны працаваць, рэпеціраваць. Калі і сядзелі дома, то ўвесь час здымалі кліпы. Я на дачы каля 50 песень а капэла запісаў, жонка Анастасія ўсё здымала. Таццяна Карабкова наздымала шмат сюжэтаў, дзе на скрыпцы іграла. Людміла Кірыленка таксама замалёўкі а капэла дасылала. Рабілі кліпы на вуліцы з канём, у нацыянальных строях. Калі кожны дзень рэпетыцыі, творчасць, гэта дае плён: расцеш над сабой. І ўсё дзякуючы імпэту ад працы, любові да народнай песні.

— А вы маглі б гэты імпэт знайсці ў іншай сферы?

— «Свята» — гэта ўжо маё жыццё, тут я вырас. Са «Святам» мы адно цэлае, разам прайшлі вялікі шлях. Я ўдзячны Васілю Ліцвінку, які ў свой час параіў у гэтым калектыве працаваць. Ён узначальваў Саюз фалькларыстаў Беларусі. Нельга не згадаць Уладзіміра Раговіча, які выдаваў песні на палескім дыялекце. Я многа ў творчы багаж узяў. У свой час у нас працавалі заслужаныя артысты Рэспублікі Беларусь Святлана і Уладзімір Салодкія, заслужаная артыстка Марыя Маршак, таленавіты артыст Міхась Пацук. Калі палічыць усіх, хто прайшоў праз «Свята», сцэна філармоніі была б, відаць, паўнюсенькая. Хацеў бы шчыры дзякуй сказаць таксама Анатолю Казаку, які займаецца фальклорам, кіраўніку калектыву «Крэсіва». Ён выдатны як рэпетытар па вакале, прынёс багата цікавых твораў, якія выкарыстоўвае наш ансамбль. Я надзвычай рады, што мне было ў каго вучыцца стаўленню да творчасці, да нашай роднай песні.

Гутарыла Наталля СВЯТЛОВА

Міхась ПАЗНЯКОЎ

Вячаславу Статкевічу

Ты быў народжаны для песні —
Народнай, сонечнай, жывой.
Узнёслы, апантаны, весні,
Ты ёй адданы ўсёй душой.

Ты быў народжаны для свята,
Стварацъ народу пазітыў.
І тваім лёсам стала «Свята» —
Цудоўны, слынны калектыў.

Ты быў народжаны для славы.
І хоць за ёй не гнаўся сам,
Ды яркі брэнд Статкевіч Слава
Вядомы вёскам, гарадам.

Вядомы добра ўсёй краіне,
Зусім не дзеля ўзнагарод
Ты ёй удзячным, шчырым сынам
Спяваеш, служыш трыццаць год!

Табе Ўсявышнім і бацькамі
Падоран голас залаты.
О, колькі акрыліў з гадамі
Прыгожых сэрцаў песняй ты!

Нясі ж далей высока, годна
На беларускі ўвесь прасцяг
Заўжды любімы ўсенародна
Радзімай песні горды сцяг!

Кат — пасажны бацька дзекабрыста

Пры савецкай уладзе згадвалі яго вельмі рэдка. Толькі ў сувязі са зняволеннем дзекабрыстаў у Пятроўскім Заводзе. Як жа ні ўспомніць гэтага турэмнага ката, які стольскі ім зла прычыніў. І цяпер стаўленне да яго часцей не вельмі прыязнае. Забываюць многія, што не месца ўпрыгожвае чалавека. Як і тое, што сапраўдныя людзі — заўсёды людзі. Такім чалавекам і быў камендант Нерчынскіх руднікоў Станіслаў Ляпарскі.

Станіслаў Ляпарскі.

Яго малая радзіма — колішняе мястэчка Свір, размешчанае на беразе аднайменнага возера. Тады адносілася да Ашмянскага павета, цяпер — гарадскі пасёлак у Мядзельскім раёне. Па іншых звестках — сядзіба Ляпарскае ў Магілёўскай губерні. Нарадзіўся ў 1754 годзе. У Полацкім езуіцкім калегіуме дасканала авалодаў лацінскай, французскай і нямецкай мовамі. Працаваў у Гродзенскай духоўнай семінарыі, але перамагла любоў да вайсковай службы. У 21 год стаў радавым па вольным найме, праз чатыры гады ўжо быў афіцэрам, ардынарцам фельдмаршала Пятра Румянцава.

Не абышлі Станіслава Ляпарскага такія знакавыя падзеі, як штурм і ўзяцце крэпасці Ізмаіл, перамога над туркамі пад Сілістрыяй. Даслужыўшыся да палкоўніка, узначаліў Северскі конна-егерскі полк, у якім некалі пачынаў службу. Па ўласным вопыце ведаў, як радавому цяжка, таму ні аднаго салдата не аштрафаваў, а тады і гэта практыкавалася. Нікога пад суд не аддаў. З павагай і цеплынёй ставіўся да афіцэраў. Звольненым са службы дапамагаў грашыма. Дзеля гэтага нават прадаў свой дом.

У адстаўку пайшоў у званні генерал-маёра. На развітанне афіцэры падарылі яму залаты кубак. Пасяліўся ў Курску, дзе бываў неаднойчы і які падабаўся. Так і жыў бы спакойна, калі б пра яго не ўспомніў сам імператар Мікалай I. У іх склаліся ў нечым нават сяброўскія адносіны. Мікалай Паўлавіч, тады вялікі князь, шэфстваваў над Северскім палком. Прыязджаючы рабіць агляд ці інспекцыю войска, спыняўся ў Ляпарскага на кватэры. Пазней часта перапісваліся.

Як жа здзівіўся Святаслаў Раманавіч, калі да яго прыбыў фельд'егер са сталіцы з важкім пакетам з цвёрдай паперы — ад начальніка генеральнага штаба барона Івана Дзібіча. Той пісаў, што «государь император, полагаясь в полной мере на правоту Вашего превосходительства, строгие правила чести и преданность Вашу престолу, намерен вверить вам весьма важный, особенно по нынешним обстоятельствам, пост коменданта в Нерчинске, ибо государственные преступники, требующие особенного, строгого и благоразумного надзора, большею частию будут находиться на работах в тамошних рудниках […]».

З «дзяржаўнымі злачынцамі» ён сутыкаўся, дастаўляючы ў 1794 годзе ў Сібір удзельнікаў паўстання пад кіраўніцтвам Тадэвуша Касцюшкі. Пакінуў іх там і — назад… Цяпер жа давядзецца знаходзіцца сярод іх не год, не два… Магчыма, і да канца дзён сваіх. Прасцей імператару адмовіць. Прасцей, аднак і складаней. Вырашыў не псаваць адносіны.

Уладзіўшы справы, накіраваўся ў Пецярбург для атрымання інструкцыі. Пасля была аўдыенцыя ў Мікалая I. Імператар уважліва пазнаёміўся з інструкцыяй, вярнуў са словамі:

— Глядзі, Ляпарскі, будзь асцярожны. За самую бязладзіцу ты мне строга адкажаш. Я не пагляджу на тваю 40-гадовую службу. Інструкцыю нікому не паказвай.

Паблізу сяла Акатуй у Забайкаллі, дзе знаходзіліся вялікія паклады сярэбранай руды, ужо спешна будавалі астрог для асуджаных. Пакуль што іх утрымлівалі ў Чыце, куды Станіслаў Ляпарскі прыбыў у студзені 1827 года. У тым жа годзе на Зарантуйскі руднік прыслалі партыю дзекабрыстаў. Сярод іх быў і паручнік Іван Сухінаў, прыгавораны да чацвяртавання, якое замянілі пажыццёвай катаргай.

Ён сагітаваў каля 20 чалавек, ахвотных напасці на казармы Нерчынскіх руднікоў. Каб, захапіўшы зброю, перадаць яе катаржанам і вызваліць дзекабрыстаў. Не здагадваўся, што ёсць здрайца. Пачалося следства. Разумеючы, што спагады не будзе, двойчы спрабаваў атруціцца. Аднак яго ўратоўвалі, каб больш мець важнай інфармацыі.

Разам з яшчэ пяццю змоўшчыкамі Сухінаў быў прыгавораны да 400 удараў бізуном з далейшага павешання. Канчатковае рашэнне залежала ад Станіслава Раманавіча. Каб аблегчыць пакуты смяротнікаў, ён адмяніў бізуны, а павешанне замяніў расстрэлам. Але загадзя пра сваё рашэнне не паведаміў. Таму Іван Сухінаў усё ж здзейсніў самагубства.

Не думаў Станіслаў Ляпарскі, што так будзе пачынаць службу на новым месцы. Усведамляў, з якім дакорам паглядзяць на яго дзекабрысты. Ды асуджаць заўсёды лягчэй. Было і тое, што паляпшала настрой. Вырашыў для сябе раз і назаўсёды: наколькі зможа, клапаціцца, каб хоць у нечым аблегчыць іх жыццё.

Шукаючы іншае месца для размяшчэння дзекабрыстаў, спыніўся на пасёлку Пятроўскі Завод. Цяпер гэта горад Пятроўск-Забайкальскі. Наўкола распасціраліся горы, атуленыя хвойнымі лясамі. Лепшага месца не знойдзеш. На свежым паветры асуджаныя будуць менш хварэць. Мікалай I, калі яму паведамілі пра выбар Святаслава Раманавіча, адказаў: «Па яго меркаванні».

У Пятроўскі Завод, у спецыяльна пабудаваную турму, перавялі з Чыцінскага астрога 71 чалавека. У гэтым пасёлку пасля прыезду да мужоў сяліліся і іх жонкі. Дамы і сядзібы размяшчаліся паблізу каземата на адной вуліцы, якая атрымала назву Дамская.

Першае, што зрабіў Святаслаў Ляпарскі, — дамогся размяшчэння ў казарме вокнаў. Святло ў яе прабівалася толькі праз акно над казематнымі дзвярыма, якія вялі ў калідор. Абгрунтаваў сваю просьбу так: у пастаяннай цемнаце дзекабрысты могуць з глузду з'ехаць.

Адкрыта дзейнічаў не заўсёды. Не хацеў, каб западозрылі ў жаданні падацца добранькім. Рабіў жа ўсё ад шчырага сэрца. Стараўся хоць неяк прыўкрасіць дзекабрыстам нялёгкае жыццё. Так было і пасля стварэння імі арцеляў Вялікай і Малой. Вялікая ўзнікла яшчэ ў Чыцінскім астрозе. Стала першым спажывецкім таварыствам у Расіі. Оптам закупленыя тавары абыходзіліся значна танней. Свайго роду ажылкам яе з'яўлялася газетна-часопісная арцель. Арганізоўвала падпіску на кнігі і перыядычныя выданні. Малой арцеллю назвалі касу ўзаемадапамогі. Аказвалі падтрымку тым, хто накіроўваўся на пасяленне. Дапамагалі жонкам, дзецям дзекабрыстаў. Не толькі аднаразова. Дзякуючы гэтай касе дочкі Міхаіла Кюхельбекера скончылі Дзявочы інстытут Усходняй Сібіры.

Колькі канкрэтна грошай унёс Станіслаў Раманавіч у арцель, невядома, аднак нямала. Зарабляў шмат, а траціць не было на што. Чалавекам быў шчодрым. Расшчодрыўся і стаўшы па волі Мікалая I… пасажным бацькам. Гісторыя гэтая звязана з каханнем сына генерала Пятра Івашава.

Васіль атрымаў бліскучую адукацыю. Быў ад'ютантам вядомага военачальніка Пятра Вітгейнштэйна. Бацька не сумняваўся, што знойдзе сабе прыгожую нявесту. Знайсці знайшоў, аднак… Гэта была 18-гадовая пляменніца старой гувернанткі Івашавых француженка Каміла Ле Данцю. Бацьку хацелася, каб нявестка была з прэстыжнай сям'і. А Васіль, старэйшы за Камілу на адзінаццаць гадоў, павёў сябе як хлапчук. Прабраўся з нажніцамі да каханай у пакой. Непрыкметна адрэзаў з яе каштанавай касы, якая яму вельмі падабалася, цэлы жмут валасоў.

А тут яшчэ генерал Пётр Івашаў даведаўся, што сын быў звязаны з дзекабрыстамі. Ні сувязі, ні аўтарытэт не дапамаглі. Васіля прысудзілі да 15 гадоў катаргі. Каміла ад перажыванняў злягла. Урачы ніяк не маглі вылечыць яе. Цётцы яна прызналася, што паправіцца, калі дазволяць ехаць да Васіля і выйсці за яго замуж. Змякчылася сэрца Пятра Іванавіча. Паспяшаўся па дазвол да імператара...

Аб прыездзе яе ў Пятроўскі Завод Станіслава Ляпарскага праінфармавалі загадзя. Выклікаўшы Васіля, загадаў яму чакаць нявесту ў Марыі Валконскай. Пасля было вянчанне ў царкве. Прысутнічаў там і Станіслаў Раманавіч. У парадным мундзіры з генеральскай стужкай. За няхітрым вясельным сталом быў пасажным бацькам.

Наколькі мог, стараўся аблегчыць жыццё дзекабрыстаў. Дамогся вызвалення іх ад кайданоў. Для лепшага харчавання дазволіў зрабіць агароды. З'явілася на стале і сваё мяса. Некаторыя афіцэры з яго дазволу ў вольны час станавіліся паляўнічымі. Штосьці сабе на стол, але шмат дзічыны аддавалі і жонкам дзекабрыстаў.

Задаволены Станіслаў Ляпарскі толькі часам папярэджваў: «Нікому ні слова. Каб не даведаліся шпігоны». Так называў даносчыкаў і шпіёнаў, якіх вельмі не любіў.

Быў і свайго роду пасрэднікам паміж зняволенымі і блізкімі ім людзьмі. Тым, хто застаўся на свабодзе, дазвалялася пісаць ссыльным. Аднак самім ім гэта забаранялася катэгарычна. Жонкі зняволеных, якія прыехалі да сваіх мужоў, сталі своеасаблівымі карэспандэнтамі паміж тымі, хто дзяліў нягоду адзін, і іх блізкімі на радзіме. Выгнаннік апісваў сваё жыццё. Жанчына, якая апекавалася ім, перапісвала. Пасылала іх адрасату ад свайго імя, называючы прозвішча таго, хто прасіў гэта паведаміць.

Па абавязку службы Станіслаў Раманавіч часам прачытваў не адзін дзясятак лістоў за тыдзень. Разумеў, што назіраецца ўцечка інфармацыі з катаргі. Аднак нічога не выкрэсліваў. Праглядаючы газеты і часопісы, рабіў пазнаку «прачытаў». Калі ж карэспандэнцыя была на англійскай, іспанскай, італьянскай, грэчаскай мовах і нават на іўрыце, пісаў «прагледзеў».

Усюды і ва ўсім заставаўся чалавекам. А яшчэ гэта быў сапраўдны афіцэр. 65 гадоў аддаў вайсковай службе, з іх 11 — няўдзячнай. Разумеў, што пасада начальніка Нерчынскіх руднікоў славы яму не прынясе. Яшчэ і будуць успрымаць душыцелем тых, хто ўвасабляў сабой свабодную Расію. Але менш думаў пра сябе. Перад тым, як атрымаць званне генерал-лейтэнанта, прызнаваўся дзекабрыстам: «Что скажут и напишут обо мне в Европе… Скажут, что я бездушный тюремщик, палач, притеснитель, а я дорожу этим местом только для того, чтобы защитить вас от несправедливости бессовестных чиновников. Какая польза мне от получения чинов и звезд, когда здесь их некому показать? Дай Бог, чтобы меня скорее освободили отсюда, но только вместе с вами».

Калі развітваўся з тымі, для каго быў «цар, Бог і воінскі начальнік», заўсёды станавілася не па сабе. Калі ж хто-небудзь паміраў, адчуваў гаркаваты прысмак. А дзекабрысты, ад'язджаючы на пасяленне, везлі з сабой партрэты Станіслава Раманавіча. З яго дазволу маляваў іх Мікалай Бястужаў. Ляпарскі захоўваў яго пейзажы, а яшчэ вершы Аляксандра Адоеўскага. Збіраў Станіслаў Ляпарскі розныя сібірскія матэрыялы.

Апошнім часам узмацнялася пачуццё адзіноты. Шчыра паразмаўляць можна было толькі з пляменнікам Восіпам Адамавічам, які служыў пры ім. Але ці ёсць сэнс ад'язджаць адсюль? Над гэтым таксама думаў шмат. Пакуль не прыняў канчатковае рашэнне — з Забайкаллем не развітвацца. У пачатку 1837 года ў яго здарыўся востры сардэчны прыступ. 30 мая 1837 года развітаўся з зямным жыццём.

Адпявалі ў царкве Святых Пятра і Паўла. З болем у сэрцы развіталіся з ім дзекабрысты. На царкоўных могілках і пахавалі. З цягам часу помнік паваліўся, магіла зраслася з зямлёй. Помнік, які адшукалі ў 1976 годзе, адноўлены быў толькі праз 27 гадоў. На чыгуннай калоне надпіс: «Прослужил российскому престолу 65 лет». А ў Пятроўску-Забайкальскім працуе музей дзекабрыстаў.

...Часам мне становіцца не па сабе. Я ж мог пабываць там! Два гады, з 1969-га да 1971-га, служыў лейтэнантам у адной з часцей Забайкальскай ваеннай акругі ўсяго за нейкіх 70 кіламетраў. Не, матэрыялы музея ўбачыць не мог, ён адкрыўся толькі ў 1980 годзе. Але ж на пероне чыгуначнай станцыі «Пятроўскі Завод» ужо тады знаходзіўся помнік-партал з васьмю барэльефамі дзекабрыстаў. Захаваўся склеп-капліца Аляксандры Мураўёвай. Ды і могілкі, хай сабе на той час і не добраўпарадкаваныя...

Алесь МАРЦІНОВІЧ

Простыя рэчы

Калі шкло ў цуд ператвараецца

Мастацтва — дзіўны свет, які прыцягвае да сябе таямнічасцю і незвычайнасцю. А мастак — чалавек з тонкім бачаннем жыццёвых з'яў.

Вельмі тонка адчувае гэты свет Вольга Кулікова, майстар народных промыслаў аддзела рамёстваў і традыцыйнай культуры Астравецкага раённага цэнтра культуры і народнай творчасці. Пра яе дзейнасць можна апавядаць бясконца: карціны, малюнкі, дэкаратыўныя ўпрыгажэнні здзіўляюць многіх. Не пакідаюць нікога абыякавымі і шкляныя вырабы, распісаныя рукой майстрыхі. Звычайнае шкло відазмяняецца пад яе пэндзлем і становіцца казачным і незвычайным.

Нарадзілася таленавітая дзяўчына ў горадзе Прыпяці, што ва Украіне. Магчыма, там і склалася б жыццё Вольгі, калі б не збег абставін. Пасля аварыі на Чарнобыльскай АЭС яна разам з сям'ёю пераехала ў Беларусь. Даўняе захапленне мастацтвам прывяло ў Бабруйскі дзяржаўны прафесійна-мастацкі каледж, які скончыла ў 2002 годзе. Так нарадзіўся мастак роспісу па дрэве.

Вольга Кулікова.

Маладая, энергічная, яна поўнасцю аддавала сілы і час любімаму занятку. Разам з выхаванцамі Рудзенскага цэнтра пазакласнай работы стваралі сапраўдныя шэдэўры. Вольга з замілаваннем прыгадвае той час і першых вучняў. У 2010 годзе захапілася размалёўкай шкла і ўвесь вольны час прысвяціла ўлюбёнай справе. Воляй лёсу таленавіты майстар трапляе на Астравеччыну і ўжо амаль цэлы год працуе ў раённым цэнтры культуры і народнай творчасці.

Старанная, творчая, таленавітая — так характарызуюць Вольгу калегі. Можна бясконца назіраць за яе працай. На вачах адбываецца сапраўдны цуд. Звычайны шкляны выраб набывае сваю душу, пачынае іграць новымі фарбамі.

Калаж Святланы Таргонскай.

Мастацтва — цуд. У гэтым упэўнена і сама майстар. А цуды Вольга Іванаўна штодзённа стварае ў сваёй творчай майстэрні.

Вольга ЗАЯНЧКОЎСКАЯ, фота аўтара

зваротная сувязь

«Увесь свет — тэатр!..»

Праграма «Літаратурная анталогія» на канале «Культура» Беларускага радыё прапануе працяг рамана Фёдара Дастаеўскага «Злачынства і пакаранне» (да 200-годдзя з дня нараджэння класіка рускай літаратуры) у выкананні Алега Вінярскага. У «Радыёбібліятэцы» гучыць аповесць Людмілы Рублеўскай «Сэрца мармуровага анёла», чытае Маргарыта Захарыя. У выхадныя ў праекце «Літаратурныя гісторыі» слухачоў чакаюць апавяданні беларускіх і замежных аўтараў, для аматараў паэзіі — праграма «Прачулым радком», якая гэтым разам прапануе вершы Генадзя Пашкова.

Змест праграмы «Радыётэатр плюс» у суботу і нядзелю складуць радыёверсіі спектакляў Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Я. Коласа «Несцерка» і «Машэка» паводле Віталя Вольскага (да 95-годдзя ўстановы).

Юным прыхільнікам мастацкага вяшчання канал «Культура» прапануе ў выхадныя праект «Дзіцячы радыётэатр» — дзве часткі пастаноўкі «Вершнік без галавы» паводле Томаса Майна Рыда. Чытанні ладзяцца па буднях у межах праекта «Дасціпныя. Нястомныя. Кемлівыя». У гэтыя дні гучаць гісторыі з кнігі Аксаны Спрынчан «Таташ Яраш, мамана Аксана і дачэта Альжбета», з 2 снежня — твор «З кім пайсці ў разведку» Паўла Місько. Штовечар у 21:00 для маленькіх «Вячэрняя казка».

Публіцыстычны суботні праект «Кнігарня» пазнаёміць з літаратурнымі падзеямі і навінкамі беларускіх выдавецтваў, а таксама са зместам свежага нумара штотыднёвіка «ЛіМ».

Госць эфіру радыёверсіі праграмы «Суразмоўцы» праекта Навума Гальпяровіча «Сюжэт для вечнасці», што гучыць у нядзелю і сераду, — пісьменнік, кандыдат філалагічных навук Ягор Конеў.

У праграме магчымы змены. Расклад перадач канала «Культура» даступны на сайце *www.radiokultura.by* і ў сацыяльных сетках.

Мінскае гарадское аддзяленне Саюза пісьменнікаў Беларусі запрашае:

26 лістапада — у літаратурную гасцёўню «Літарынка» пры СШ № 170 (вул. Рафіева, 7) на творчую сустрэчу з паэтэсай Аленай Свечнікавай (14.00).

26 лістапада — у публічную бібліятэку № 2 (вул. Усходняя, 56) на творчую сустрэчу з пісьменнікам Яўгенам Хвалеем (14.00).

2 снежня — у Дом літаратара (мемарыяльная зала) на сустрэчу з расійскімі дзіцячымі пісьменнікамі і выдаўцамі (14.30).

2 снежня — у літаратурную гасцёўню «Аўтограф» пры інтэрнаце БДЭУ (вул. Карбышава, 42) на творчую сустрэчу з паэтэсамі Інай Фраловай і Валерыяй Ісаковіч (18.30).

ЛіМ КАЛЯНДАР

27 лістапада — 115 гадоў з дня нараджэння Юрыя Арынянскага (1906—1989), акцёра, рэжысёра, заслужанага дзеяча мастацтваў БССР.

27 лістапада — 70 гадоў з дня нараджэння Генрыха Обухава (1941—1979), мастака манументальнага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.

28 лістапада 85 гадоў спаўняецца Марыі Захарэвіч, актрысе, народнай артыстцы БССР.

28 лістапада 75-годдзе адзначае Мікалай Гугнін, мастацтвазнавец, педагог, графік.

29 лістапада 70-гадовы юбілей святкуе Аляксандр Гвоздзікаў, скульптар.

29 лістапада 70-гадовы юбілей адзначае Валерый Дайнека, эстрадны спявак, заслужаны артыст БССР.

1 снежня 70 гадоў спаўняецца Таісе Грамадчанцы, крытыку, літаратуразнаўцы.

2 снежня — 245 гадоў з дня нараджэння Анёла Доўгірда (1776—1835), філосафа, паэта, выкладчыка Віленскага ўніверсітэта.

3 снежня — 230 гадоў з дня нараджэння Міхаіла Гамаліцкага (1791—1861), беларускага гісторыка, літаратара, урача.

3 снежня 70-гадовы юбілей адзначае Іван Кліменка, беларускі жывапісец, педагог.

* * *

215 гадоў таму нарадзіўся Юльян Карчэўскі (1806—1833), беларускі жывапісец.

45 гадоў таму (1976) быў створаны Магілёўскі абласны тэатр лялек.

Калектыў Гродзенскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі глыбока смуткуе з прычыны смерці таленавітага беларускага паэта Міколы Віктаравіча ШАБОВІЧА і выказвае шчырыя спачуванні яго родным і блізкім.

Саюз пісьменнікаў Беларусі і Віцебскае абласное аддзяленне СПБ смуткуюць з прычыны смерці найстарэйшага пісьменніка, члена Саюза пісьменнікаў Беларусі Віктара Раманавіча КАРАСЁВА і выказваюць глыбокія спачуванні яго родным і блізкім.

Выходзіць з 1932 года

ЛіМ

Заснавальнікі: Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь, грамадскае аб'яднанне «Саюз пісьменнікаў Беларусі», рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом "Звязда"»

Галоўны рэдактар Аляксей Іванавіч ЧАРОТА

Рэдакцыйная калегія: Таццяна Арлова, Алесь Бадак, Дзяніс Барсукоў, Віктар Гардзей, Уладзімір Гніламёдаў, Вольга Дадзіёмава, Жана Запартыка, Анатоль Казлоў, Анатоль Крэйдзіч, Віктар Кураш, Алесь Марціновіч, Вячаслаў Нікіфараў, Мікалай Чаргінец, Іван Чарота, Іван Штэйнер

Адрас рэдакцыі: Юрыдычны адрас: 220013, Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а
E-mail: info@zviazda.by

Адрас для карэспандэнцыі: 220034, Мінск, вул. Захарава,19
E-mail: lim_new@mail.ru
Адрас у інтэрнэце: www.zviazda.by

Тэлефоны: галоўны рэдактар — 325-85-25; намеснікі галоўнага рэдактара — 319-79-85, 224-66-74; адказны сакратар — 377-99-73; аддзел крытыкі і бібліяграфіі — 317-20-98; аддзел прозы і паэзіі — 317-20-98; аддзел мастацтва — 317-20-98; бухгалтэрыя — 311-17-16

Выходзіць раз на тыдзень у пятніцу.

Падпісныя індэксы: 63856 — індывідуальны; 63815 — індывідуальны льготны для настаўнікаў; 638562 — ведамасны; 63880 — ведамасны льготны.

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі сродку масавай інфармацыі № 7 ад 10.12.2012, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Выдавец: Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом "Звязда"». Дырэктар — галоўны рэдактар Аляксандр Мікалаевіч КАРЛЮКЕВІЧ

Нумар падпісаны ў друк 25.11.2021 у 11.00
Ум. друк. арк. 3,72
Наклад — 642

Друкарня Рэспубліканская ўнітарная прадпрыемства «Выдавецтва «Беларускі Дом друку» ЛП1 № 02330/106 ад 30.04.2004 г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 79/1. Індэкс 220013

Заказ — 2855

Д 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Рукапісы прымаюцца толькі ў электронным выглядзе (праграма Microsoft Word), не вяртаюцца і не рэцэнзуюцца. Пазіцыя рэдакцыі можа не супадаць з меркаваннямі аўтараў публікацый. Аўтары нясуць адказнасць за факты, якія прыводзяцца ў публікацыях, у адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

ISSN 0024-4686

9 770024 468001 21047